МОСКВА 19
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИН.ТУТ
СОВ.СТРОИТ.И ПРАВДА
3 1.12 38.2

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 16 (5690) | 20 студзеня 1937 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

У СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б).

Надзвычайны XVII Усерасійскі З'езд Саветаў — Ранішняе пасяджэнне 18 студзеня.

Артыкулы: Перадавы — Вышэй рэволюцыйную пільнасць, таварышы! Стаць рэспубліканскай першакласных дарог. **В. Лоскат** — У адказ пану Валеўскаму **Д. Малевіч** — Майстры высокіх ураджаяў. **Ал. Палявы** — Стаханаўскі будзе ўраджай.

У пракуратуры Саюза ССР.

На пленуме Менгаркома КП(б)Б.

Сесія Совета па вывучэнню прадукцыйных сіл БССР.

Пагранічнікі-дынамаўцы — удзельнікі ўсесаюзнага велапрабегу ўздоўж граніц СССР — прыбылі ў Менск.

Суд над забойцамі М. В. Пронінай.

За граніцай: Выступленне тав. Майскага на пасяджэнні камісіі пры лонданскім камітэце. Адказ французскага ўрада на англійскую ноту. Парушэнне польскімі пагранічнікамі польска-літоўскай граніцы. Новы правал германскай прапаганды супроць Чэхаславакіі.

ВЫШЭЙ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ, ТАВАРЫШЫ!

Закончана следства па справе паралельнага трацкісцкага цэнтра. Злоўлена з палічным новая шайка агідных паследышаў смуроднай гадзіны тройчы праклятага Троцкага.

Пятакоў, Радэк, Сакольнікаў, Серэбраўскі — вось імя гэтай кучкі, якія ненавідзяць чалавецтва. Няма ў свеце такой гадасці, якую не зрабіла-б гэта подлая кучка, няма такога злачынства, на якое не былі-б здольны гэтыя подлыя гадзіны і хямелзоны.

Ці даўно Пятакоў кляўся ў сваёй адданасці партыі? Яшчэ ў дні працэсу над тэрарыстычнай групай Каменева і Зіноўева Пятакоў біў сябе ў грудзі і ліў кракадзілавыя слёзы, патрабуючы, каб яму паверылі. Яшчэ так нядаўна ён аддаваў «анафеме» Каменева і Зіноўева. Як гадзіна, праглынаючая сваіх дзяцёнышаў, ён патрабаваў суровай кары для іх. Яшчэ так нядаўна ён ліў слёзы па поваду смерці вялікага друга і сына народу Сергея Міронавіча Кірава і ў той-жа час заражаў рэвальвер, каб пагасіць жыццё іншых кіраўнікоў партыі і ўрада. Якая дзікая мерзасць, якая нізасць! Няма меры гэтай нізасці, няма меры гэтай подласці!

Зусім ясна, што гэта паршывае атроддзе рыхтавала ўдар у спіну ў самы рашаючы для нас момант. Тое, што рабочыя і сяляне стваралі сваёй гераічнай працай, працуючы з усіх сіл, адмаўляючы часамі сабе ў неабходным, што паставалі, чаму радаваліся мільёны — гнусныя паследышы Троцкага руйнавалі, перадавалі за граніцу, раскрываючы сакрэты абароны класаваму ворагу пролетарыята.

«Следствам устаноўлена, што «паралельны цэнтр», паводле прамых указанняў Л. Троцкага, арганізаваў дыверсійныя і тэрарыстычныя групы, ажыццявіўшы на радзе прадпрыемстваў, асабліва маючых абаронае значэнне, шкодніцкія і дыверсійныя (падрыўныя) акты і падрыхтаваўшыя тэрарыстычныя акты супроць кіраўнікоў ВКП(б) і совецкага ўрада. Гэтыя-ж групы, згодна прамых указанняў Л. Троцкага і «паралельнага цэнтра», ажыццяўлялі і шпіянаж на карысць некаторых замежных дзяржаў».

Цяпер няма ніякага сумнення ў тым, што гэта самыя зласнейшыя ворагі рабочага класа. Яны не толькі ніколі не жадалі перамогі соцыялізма, але былі яраснымі яго ворагамі. Усё, літаральна ўсё рабілі гэтыя ўтоеныя пад маскай прыяцеляў рабочых і сялян ворагі народу, каб насадзіць на нашы спіны капіталістаў, каб адзець на шыю свабоднага народу ярмо.

На кавалках гатовы былі гэтыя людзі прадаць СССР, каб толькі знішчыць ненавісны ім лад соцыялізма.

Соцыялізм — гэта мара лепшых людзей. Кроў лепшых сыноў народу, нечуваныя пакуты рэволюцыянераў, зморваючая праца рабочых і сялян, голад, холад, жабрацтва — усё гэта засталося ззаду. Соцыялізм — гэта свет шчасця, радасці, свет, дзе ўпершыню працоўны стаў чалавекам. І гэты свет праклятыя адшчапенцы хацелі зруйнаваць сваімі паганымі, забрыганымі крывёю кемераўскіх рабочых рукамі.

«Следствам устаноўлена, што злачынная дзейнасць «паралельнага цэнтра» і іншых членаў трацкісцкай арганізацыі, прыцягнутых па данай справе ў якасці абвінавачваемых, была накіравана на падрыў ваеннай магутнасці СССР, паскарэнне ваеннага нападу на СССР, салзейнасць замежным агрэсарам у захваце тэрыторыі і расчляненні СССР, на звяржэнне совецкай улады і аднаўленне ў Совецкім Саюзе капіталізма і панавання буржуазіі».

Увесь свет, усё лепшае ў чалавецтве з абурэннем ускрыкне сёння: смерць подлым гадзёнышам, смерць узняўшым руку на свет прамяністага шчасця! Смерць ворагам соцыялізма!

Подлыя лакеі капітала! Усё жыццё яны поўзалі ля ног буржуазіі, аблізваючы смярдзючыя пяткі фінансавых тузаў, лічачы для сябе гэта вышэйшым шчасцем. Усё жыццё яны поўзалі на чэраве перад сваім кумірам — капіталам, жадаючы ўслужыць яму, беручы на сябе самую подлую работу катаў рабочага класа.

Перажываючы пачуццё агіды, нібы кранулася іх халодная страшэнная гадзіна, рабочыя і сяляне, раздавіўшы гэту гадзіну, пойдуць сваёй дарогай да комунізма, пад кіраўніцтвам друга і настаўніка свайго, надзеі і сэрца свайго — пад кіраўніцтвам роднага, блізкага і любімага Сталіна.

Урокі вучаць! Рабочыя і сяляне ніколі не забудуць бязмернай подласці ворагаў сваіх. Яшчэ больш уважліва яны агледзяцца вакол сябе, яшчэ раз праверуць яны строй радоў сваіх, каб да канца і без рэшткаў выкарчаваць подлую гадзіну.

Трацкізм выкрыт да канца!

Ніколі трацкісты не верылі ў соцыялізм, заўсёды яны змагаліся супроць яго паступальнага шэствія, стаўшы ўрэшце прамымі і адкрытымі ворагамі яго. Буржуазія карысталася гэтым атрадам для барацьбы з соцыялізмам. Гэта відома, гэта ясна. Але ўрок вучыць. Мы ведаем, што буржуазія заўсёды прыбягала да нявыкрытага яшчэ ворага. Раней яна карысталася паслугамі, галоўным чынам, меншавікоў і эсэраў, зараз яна карысталася паслугамі трацкістаў і іх прыспешнікаў — правых апартуністаў. Гэтага ніколі не забудуць рабочыя і сяляне СССР.

Вышэй рэволюцыйную пільнасць, таварышы!

СТАЦЬ РЭСПУБЛІКАЙ ПЕРШАКЛАСНЫХ ДАРОГ

Партыя і ўрад надавалі і надаюць дарожнаму будаўніцтву велізарнае значэнне. XVII з'езд ВКП(б) у сваёй пастанове «Аб другім пяцігадовым плане» ўказаў на неабходнасць усямернага развіцця дарожнай справы.

Выконваючы рашэнні XVII партыйнага з'езда, Совецкі Саюз у асноўным ужо завяршае ліквідацыю бездарожжа — гэтай праклятай спадчыны царскай Расіі. Краіна пакрылася густой сеткай шасейных і ўдасканаленых грунтовых дарог. У 1936 годзе пачата будаўніцтва першакласных аўтамагістралей Масква—Менск і Масква—Кіеў. З кожным годам павялічваецца ўдзельная вага аўтадарожнага транспарту ў грузавых перавозках.

Наша прымежная ордэнаносная рэспубліка, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і яго сакратара таварыша Гікало за апошнія некалькі гадоў пабудавала значную колькасць шасейных і грунтовых дарог.

План дарожнага будаўніцтва на 1937 год прадугледжвае далейшы рост дарожнага будаўніцтва, яшчэ большае развіццё сеткі шасейных і палепшаных грунтовых дарог. Будаўніцтва гравійных дарог мясцовага значэння ў БССР узрастае супроць 1936 года на 679 проц. і палепшаных грунтовых дарог на 566 проц. Гэтыя лічбы паказваюць, якія велізарныя задачы пастаўлены партыяй і ўрадам перад партыйнымі, совецкімі і дарожнымі арганізацыямі.

Па плану 1937 года прадугледжваецца значнае павелічэнне абёму механізацыі дарожных работ. Даволі ўказаць на тое, што асігнаванні на механізацыю ўзрастаюць супроць 1936 года амаль у два разы. Своечасова падрыхтаваць кадры для работы на механізмах, высокаякасна адрамантаваць усе машыны, выкарыстоўваць іх з максімальнай нагрузкай з'яўляецца важнейшай задачай дарожных арганізацый.

У мінулым годзе недастаткова выкарыстан працоўны ўдзел насельніцтва, які адыгрывае рашаючую ролю ў ліквідацыі сельскага і раённага бездарожжа. Вынік 1936 года паказваюць, што праца калгаснікаў дала дарожнаму будаўніцтву далёка не ўсё, што яна магла-б даць. Недастаткова добра выконваецца асноўная задача — стварэнне сталых дарожных калгасных брыгад, авалодаўшых тэхнікай справы і гатовых да работы ва ўсякі час года, прымацаванне пабудаваных ужо ўчасткаў дарог да асобных калгасаў, МТС, соўгасаў для своечасовага рамонту і ўтрымання гэтых дарог.

Між тым, якраз у стварэнні сталых дарожных калгасных брыгад — ключ да поўнага, найбольш эфектыўнага выкарыстання працоўнага ўдзелу насельніцтва ў дарожным будаўніцтве. Прыкладам гэтаму можа служыць Магілеўскі раён, дзе ў мінулым годзе арганізаваныя сталыя брыгады калгаснікаў забяспечылі раёну датэрміновае выкананне гадавога плана. Сталая брыгада калгаса 3-ці рашаючы» выканала гадавы план працудзелу калгаса ў дарожным будаўніцтве 2 чэрвеня і прымала ўдзел разам з усімі калгаснікамі ў правядзенні ўборачнай кампаніі.

Трэба пакончыць з недаацэнкай дарожнага будаўніцтва, якая назіраецца ў некаторых раёнах. Дубровенскі раён, напрыклад, у мінулым годзе некалькі разоў выносіў пастановы аб выкананні плана, аднак, план ён выканаў толькі на 50 проц. У гэтым годзе кіраўніцтва раёна таксама не рыхтуецца да дарожна-будаўнічага сезона. Няма патрэбы даказваць, што такія кіраўнікі раёна не разумеюць ні эканамічнага, ні палітычнага значэння дарожнага будаўніцтва.

Па будаўніцтве дарог і ў эксплаатацыі дарожнай гаспадаркі за мінулы год вырасла нямала стахانаўцаў, паказаўшых узоры высокапрадукцыйнай працы. Сталая калгасная брыгада калгаса «Чырвоны Станшын», Магілеўскага раёна (брыгадзір тав. Паважары), выконвала сваю норму на 400—420 проц. Брыгада Васілеўскай Мані з калгаса «Чырвоная Каменка» ў два разы перакрывала планавыя заданні. Партыйныя і профсаюзныя арганізацыі дарожных органаў заявязаны ўзначаліць стахانаўскі рух, арганізаваць соцыялістычнае спаборніцтва на будаўніцтве дарог, перадачу вопыту лепшых стахانаўцаў усім дарожнікам, стварыць ім усе ўмовы для высокапрадукцыйнай працы.

Старшыні сельсоветаў, калгасаў, дарожныя секцыі і дарожныя брыгадзіры калгасаў раду раёнаў выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва ўсе сельсоветы і калгасы БССР на лепшае выкананне дарожных работ 1937 года. Няма ніякага сумнення ў тым, што іх выклік знойдзе жывейшы водгук ва ўсіх кутках нашай рэспублікі. Няма ніякага сумнення, што на аснове шырока разгорнутага соцыялістычнага спаборніцтва БССР забяспечыць выкананне і перавыкананне дарожных работ апошняга года другой пяцігодкі і стане рэспублікай першакласных дарог.

Надзвычайны XVII Усерасійскі З'езд Саветаў

ДЗЕННІК З'ЕЗДА

Ранішняе пасяджэнне 18 студзеня

На ранішнім пасяджэнні з'езд віталі дэлегацыі Чувашскай, Крымскай АССР, рэспублікі немцаў Паваложжа і Ленінградскай вобласці. Пасля гэтага прадаўжаліся спрэчкі па дакладу тав. М. І. Калініна.

Трэці дзень абмяркоўвае з'езд праект новай Канстытуцыі РСФСР, і кожнае выступленне насычана фактамі, якія сведчаць аб чароўным жыцці, якога дабіліся народы Расійскай Федэрацыі ў рэзультаце перамогі соцыялізма на адной шостай частцы земнага шара.

Калізальныя перамены адбыліся на гэтым неабсяжным прасторы! Аб іх расказваюць старшыня Усходне-Сібірскага аблвыканкома тав. **Я. З. Пахомаў**, старшыня Саратаўскага аблвыканкома тав. **Е. Э. Фрэшэр**, старшыня ЦВК і Соўнаркома Удмуртскай АССР тав. **Г. А. Іваноў** і старшыня Соўнаркома Якутскай АССР тав. **Х. П. Шараборын**.

Неаднаразова прарываецца аплядысментамі яркая прамова акад. **Л. А. Орбелі**. Ён падкрэслівае, што толькі ў краіне соцыялізма магчыма поўнае яднанне людзей працы і навукі, якія аддаюць сілы на ўмацаванне магутнасці сваёй вялікай радзімы.

У спрэчках па дакладу тав. М. І. Калініна выступілі таксама тт. **Шуноева** (Кабардына-Балкарыя), **Белякова** (Варонежская вобласць), **Яблонскі** (Паўночна-Каўказскі край), **Хатанзеева** (Омская вобласць), **Кулькоў** (МГК ВКП(б)), **Архіпаў** (Карэльская АССР), **Сурдзін** (Марыйская АССР) і старшыня Ненецкага акрвыканкома Паўночнай вобласці тав. **І. Ф. Тайбарэй**.

Па прапанове тав. Ю. М. Кагановіча прымаецца пастанова — **адобрыць і прыняць за аснову прадстаўлены праект Канстытуцыі РСФСР, для разгляду ўнесеных паправак і дадаткаў і ўстанаўлення канчатковага тэкста Канстытуцыі РСФСР стварыць Рэдакцыйную Камісію ў складзе 164 чал. і даручыць Рэдакцыйнай Камісіі ў двухдзённы тэрмін прадставіць на разгляд З'езда канчатковы тэкст Канстытуцыі, улічыўшы пры гэтым рэзультаты абмеркавання праекта Канстытуцыі на З'ездзе.**

Старшыня Калінінскага аблвыканкома тав. Іваноў ад імя раду дэлегацый прапануе персанальны склад Рэдакцыйнай Камісіі, які аднагалосна прымаецца З'ездам.

Бурная авацыя грыміць у зале, калі тав. Іваноў называе роднае мільёнам імя **Сталіна**. Усе ўстаюць і з захапленнем вітаюць абранне ў Рэдакцыйную Камісію мудрага творца Канстытуцыі Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Пасля зацвярджання складу Рэдакцыйнай Камісіі старшынствуючы тав. Г. М. Крутаў аб'явіў работу З'езда прарванай да 21 студзеня.

ВЫКЛІК НА СПАБОРНІЦТВА

Стаханаўцам і ўдарнікам Менска, Гомеля, Віцебска і Магілева.

Заклік лепшых сталяраў, пісьмо жалезнага наркома цяжкай прамысловасці т. Орджанікідзе і пісьмо сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гікало выклікалі вялікі ўздым творчай ініцыятывы працоўных мас, новую хвалю соцыялістычнага спаборніцтва. Завод за заводам, фабрыка за фабрыкай, цэх за цэхам, брыгада за брыгадай, арцель за арцеллю становяцца ў калону спаборнічаючых. Шырока разгарнулася спаборніцтва паміж асобнымі стахانаўцамі і ўдарнікамі.

Стахانаўцы нашых фабрык, заводаў і прамысловых арцелей на заклік сталяраў адказваюць новымі рэкордамі высокай прадукцыйнасці працы. 2 студзеня першая змена лесапэха № 1 дрэваапрацоўчага камбіната дала 109,5 проц. тэхнічнай магутнасці пэха. Рамшчыкі Белякоў, Мельнікаў, Кулікоўскі даюць 105—116 проц. тэхнічнай нормы. Лушчыльшчык фанернага завода імя Кірава т. Цэйтлін выконвае тэхнічную норму на 150 проц. Капельшчыкі завода імя Сталіна Маркевіч і Рысакоў выканалі 7 студзеня новую норму выпрацоўкі на 467 проц. Токар Агейчык—на 307 проц. 13 студзеня капельшчык Маркевіч выканаў сваю норму на 483 проц.

Мы лічым неабходным арганізаваць спаборніцтва прамысловасці і прамысловай кааперацыі пяці буйнейшых гарадоў БССР — Менска, Гомеля, Віцебска, Магілева і Бабруйска на лепшае датэрміновае выкананне плана 1937 года як па колькасных, так і асабліва па якасных яго паказальніках.

Мы прыступаем да складання ўмоў спаборніцтва і абмеркавання іх на сходах рабочых усіх прадпрыемстваў. Абмеркаванне пунктаў дагавору мы ператворым у дні барацьбы за новыя вытворчыя рэкорды, у дні асваення тэхнічных магутнасцей абсталявання і выканання новых норм выпрацоўкі ўсімі рабочымі. Гэтыя паказальнікі прадукцыйнасці працы мы ўключым у дагавор.

Спадзяемся, што вы падтрымаеце гэту прапанову. Просім паведаміць аб вашым рашэнні па гэтаму пытанню.

Ад імя нарады стахانаўцаў і трыкутнікаў прадпрыемстваў і арцелей Бабруйска:

Сакратар Бабруйскага райкома КП(б)Б ЧАРНЫШОЎ.

Старшыня райпрофсовета УЗДЗІНСКІ.

21 студзеня спаўняецца 13 гадавіна з дня смерці В. І. Леніна. НА ЗДЫМКУ: В. І. Ленін і І. В. Сталін у Горках у 1922 г.

У СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б)

Соўнарком Саюза ССР і ЦК ВКП(б) прынялі пастанову «Аб арганізацыі пасеваў проса чыстагатунковым насеннем і аб паляпшэнні насенаводства па просу». У пастанове гаворыцца:

— Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) устанавілі, што проса — адна з важнейшых харчовых культур — у рэзультаце нагардлівых да яго адносін з боку зямельных органаў аказалася на становішчы бросавай культуры. Па гэтай культуры ні ў Наркамземе, ні ў сельгасакадэміі не працуе спецыяльна ні адзін чалавек. Плошчы гатунковых пасеваў проса раступ у мізэрнай меры, масавыя пасевы робяцца розначасова паспяваючай, неўраджайнай, беспраднай сумессю, насінаводства запушчана і заблытана.

У той-жа час, у рэзультаце ініцыятывы паасобных калгасаў, соўгасаў, агранамаў і даследчых станцый, дасягнуты значныя поспехі па вывядзенню новых гатункаў і размнажэнню добрага насення проса.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) устанавілі, што ў краіне ёсць зусім дастатковыя рэсурсы добрага насення проса, каб ужо ў 1937 годзе пашырыць гатунковыя пасевы проса ў 4 разы ў параўнанні з 1936 годам, а ў 1938 годзе перайсці цалкам да пасеваў проса толькі гатунковым адборным насеннем.

У адпаведнасці з гэтым Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) пастанавілі:

I

АБ ПЛАНЕ ГАТУНКОВЫХ ПАСЕВАЎ ПРОСА НА 1937 ГОД

1. Зацвердзіць на 1937 год план гатунковых пасеваў проса на плошчы 1 мільён гектараў замест 240 тысяч гектараў у 1936 г.

2. Абавязаць Камзаг СНК Саюза ССР і Наркамзем Саюза ССР для забеспячэння насеннем плана гатунковых пасеваў проса:

А) Дадаткова загатовіць у калгасах у парадку абмену на пшано не менш 110 тысяч цэнтнераў гатунковага проса, у тым ліку па гатунках:

1. «Саратаўскае арнольдаўскае»	48,3 тыс. цнт.
2. Надалінскае	23,0 тыс. цнт.
3. «Чырвонае тойдзенскае»	26,8 тыс. цнт.
4. Харкаўскае № 436	2,0 тыс. цнт.
5. Безенчукскае	0,8 тыс. цнт.
6. Оранбургскае чырвонае	1,1 тыс. цнт.
7. Краснакуцкае	0,6 тыс. цнт.
8. Саратаўскае № 742	0,6 тыс. цнт.
9. Мясцовыя гатункавыя	6,8 тыс. цнт.

Б) Забараніраваць для пасеўных мэт раней загатоўленае Дзяржгатунфондам і Заготзярно чыстагатунковае проса ў колькасці не менш 60 тыс. цнт.

3. Устанавіць, што калгасы, якія прадстаўляюць дзяржаве гатунковае проса вышэй указаных гатункаў, атрымліваюць 32 фунты пшана за пуд гатунковага проса.

4. Водпуск гатунковага проса калгасам для пасеву праводзіць у парадку абмену ўвосень 1937 года натурай—гатунковым просам таго-ж гатунку з надбаўкай 10 проц.

II

АБ ЗАБЕСПЯЧЭННІ ПАСЕВАЎ ПРОСА 1938 ГОДА ГАТУНКОВЫМ НАСЕННЕМ

Забараніць, пачынаючы з 1938 года, пасеў проса не гатунковым насеннем, для чаго абавязаць Наркамзем Саюза ССР:

а) арганізаваць пасеў у 1937 годзе для насенных мэт на насенных участках ці ў спецыяльна вылучаных калгасах (1—2 на раён) не менш 138 тысяч гектараў лепшага гатунковага проса вышэй указаных гатункаў;

б) для хутчэйшага размнажэння насення лепшых гатункаў проса ў засушлівых стэповых раёнах арганізаваць пасеў на паліўных землях не менш 5 тыс. гектараў.

III

АБ НАСЕНАВОДСТВЕ І АГРАТЭХНІЦЫ ПА ПРОСУ

1. Адказваць работу па селекцыі і насенаводству проса на Безенчукскай (для Куйбышэўскай вобласці), Казанскай (для Татарскай АССР), Шацілаўскай (для Курскай вобласці) і Веселападалянскай (Галоўцукру) — для Украіны—даследчых станцыях і арганізаваць зноў работу з просам на Маскоўскай, Оранбургскай, Азова-Чорнаморскай, Камышынскай (для Сталінградскай вобласці) і Паўночна-Каўказскай даследчых станцыях. Па Казахскай ССР кіраўніцтва работай па насенаводству проса ўскладзі на даследчую станцыю Карлага НКУС.

2. Прапанаваць Наркамзему Саюза ССР у месячны тэрмін устанавіць абавязковыя агратэхнічныя правілы ў адносінах сяўбы і догляду за пасевамі проса ў залежнасці ад асаблівасці асобных сельскагаспадарчых раёнаў.

3. Абавязаць Наркамзем Саюза ССР, наркамземы саюзных і аўтаномных рэспублік і край- (абл.) земкіраўніцтва рэспублік і абласцей (краёў) з пасевам проса больш 50 тысяч гектараў выдзеліць у сваім апараце для работы па просу вопытных работнікаў.

***

СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) абавязалі соўнаркомы рэспублік, абласныя (краявыя) выканкомы, абкомы, крайкомы і ЦК нацкомпартый правесці мерапрыемствы, якія-б забяспечвалі выкананне ўстаноўленых для іх планаў гатунковых пасеваў проса. (БЕЛТА).

НА ПЛЕНУМЕ МЕНСКАГА ГАРКОМА

Тры дні, 16, 17 і 19 студзеня, працягваў сваю работу пленум Менскага гаркома КП(б)Б.

Пленум заслухаў і абмеркаваў даклады сакратара парткома фабрыкі «Комунарка» т. Рабкіна, сакратара парткома партарганізацыі Наркомасветы т. Пармона і суддаклады інструктара гаркома КП(б)Б тт. Працэнка і Рохкіна аб практыцы правядзення партыйных сходаў.

У спрэчках выступілі: тт. Суражынскі (сакратар парткома трампарка), Літвін (сакратар Сталінскага РК КП(б)Б), Гефен (сакратар парткома фабрыкі імя Кагановіча), Варончанка (сакратар Кагановіцкага РК КП(б)Б), Хадасевіч, Рыскін і інш. Усяго 13 чалавек.

У дакладах тт. Рабкіна і Пармона адсутнічала большэвіцкая самакрытыка. Яны не імкнуліся выявіць сапраўдныя прычыны слабай падрыхтоўкі правядзення партыйных сходаў, не паказалі, чаму гэта партыйныя сходы не сталі яшчэ школай большэвіцкага выхавання членаў партыі. Таму зусім правільна выступаўшыя таварышы падвергалі жорсткай большэвіцкай крытыцы метады няправільнага кіраўніцтва парткомаў пярвічных арганізацый «Комунаркі» і Наркомасветы падрыхтоўкай і правядзеннем партыйных сходаў.

У пярвічнай партарганізацыі фабрыкі «Комунарка» партыйныя сходы яшчэ не сталі баявой школай палітычнага выхавання і ідэйнай закалкі комуністаў. У партарганізацыі недастаткова разгорнута большэвіцкая крытыка і самакрытыка.

Партыйныя сходы яшчэ не стаяць у цэнтры ўвагі партыйнага камітэта. Таму зусім не дзіўна, калі такія пытанні, як партдысцыпліна, праверка выканання рашэнняў партсходаў, пытанні агітацыйнай работы не знайшлі месца ў абвестцы дня партыйных сходаў. Між іншым гэтыя пытанні не раз уздымаліся асобнымі комуністамі.

Яшчэ горш у пярвічнай арганізацыі Наркомасветы.

Пярвічная партарганізацыя мае сваю гісторыю. Гэта арганізацыя ў свой час была моцна засмечана контррэволюцыйна-трацкісцкімі, нацдэмаўскімі элементамі і іншымі ворагамі партыі і совецкага народу. У арганізацыі была страчана большэвіцкая пільнасць, працвітала падхалімства, сямейнасць.

Ці зрабіла арганізацыя, у першую чаргу партыйны камітэт, палітычныя вывады з гэтых урокаў? Безумоўна не.

Сакратар парткома т. Пармон у сваім дакладзе пленуму гаркома імкнуўся даказаць, што раней у арганізацыі ўсё было дрэнна, а зараз усё добра. Бясспрэчна, што партком тое-сёе зрабіў у справе наладжання партыйнай работы. Аднак гэта не можа задаволіць партарганізацыю.

У партарганізацыі яшчэ на сённешні дзень адсутнічае партыйная дысцыпліна. Комуністы не лічаць сваім пярвейшым абавязкам наведваць партыйныя сходы. У партарганізацыі ёсць нямала членаў і кандыдатаў партыі, як тт. Шышон, Зальцман, Мельнікаў і інш., якія за год не былі на 9 партыйных сходах з 19. Як можна прайсці міма таго, калі сход, які быў назначан на 31 кастрычніка па абмеркаванню выніку абмену партыйных дакументаў, быў сарван з-за няўкі комуністаў. Партсход, на якім было намечана абмеркаваць рашэнні ПК ВКП(б) аб педагагічных скажэннях, адкладваўся два разы.

У партыйнай арганізацыі яшчэ і на сённешні дзень пануе сямэйнасць, падхалімства. Адсутнічае агітацыйная работа. Асобныя комуністы лічаць, што ў апараце Наркомасветы непатрэбна праводзіць агітацыйную работу, паколькі ўсе людзі пісьменныя. Гэтым карыстаюцца варожыя элементы, якія працягваюць розныя контррэволюцыйныя «тэорыі». А партыйны камітэт праходзіў міма гэтых фактаў, не мабілізоўваў комуністаў на сапраўдны ўздым большэвіцкай пільнасці, на бязлітаснае выкрыццё і выкараненне контррэволюцыйных трацкісцка-зіноўеўскіх элементаў і іх пасобнікаў з лагеру правых.

17 студзеня ў рабоце пленума менскага гаркома прыняў удзел сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Гікало**.

Тав. Гікало завострыў увагу членаў пленума на той факт, што сакратары і члены парткома персанальна павінны несці адказнасць перад вышэйшымі партыйнымі арганізацыямі і перад членамі пярвічнай партарганізацыі за падрыхтоўку і правядзенне партыйных сходаў. Яны, сакратары і члены парткома, у першую чаргу адказваюць за парушэнне статута ВКП(б), асновы ўнутрыпартыйнага жыцця.

У прынятых пастановах пленум ўлічыў канкрэтныя ўказанні сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гікало і прыняў рад практычных прапаноў у справе паляпшэння правядзення партыйных сходаў, разгортвання самакрытыкі і кантролю за ажыццяўленнем статута ВКП(б).

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Ваенна-фашысцкі мяцеж у Іспаніі

Схема баявых аперацый у Іспаніі.

БАІ ЗА МАДРЫД

АГЛЯД ВАЕННЫХ АПЕРАЦЫЙ

19 студзеня споўнілася 6 месяцаў з дня пачатку ваенна-фашысцкага мяцежу ў Іспаніі. Цяпер стала зусім ясна, што без адкрытай дапамогі фашысцкай Германіі і Італіі мяцежныя генералы даўно-б пацярпелі поўнае паражэнне. Нават пры дапамозе адборных германскіх часцей і магутнай ваеннай тэхнікі мяцежнікам не ўдалося зламіць супраціўленне рэспубліканцаў і заняць сталіцу Іспаніі.

Апошнія баі, у часе якіх пацярпелі крах спробы германскіх і мараканскіх часцей абыйсці Мадрыд з паўночнага захаду, паказалі выключны рост боездольнасці і высокі гераізм рэспубліканскіх войск. Рэспубліканскія лётчыкі і танкісты паказалі цуды адвагі і гераізма.

Як паведамляе міністэрства морскага флота і авіяцыі Іспаніі, толькі ў адным снежні, у часе паветраных баёў, было збіта 25 самалётаў мяцежнікаў. Рэспубліканцы страцілі 5 самалётаў. Уладавая авіяцыя зрабіла 8 бамбардыровак аэрадромаў праціўніка. У рэзультаце былі знішчаны самалёты, лік якіх цяжка удакладніць.

Паводле апошніх паведамленняў камітэта абароны Мадрыда і агенцтваў Рэйтэр і Гавас, 17 студзеня пачаліся ўпартыя баі на поўдні ад Мадрыда ў раёне Усэра. Войскі мяцежнікаў, размешчаныя ў Карабанчэль-Альто і ў Вільявердэ, атакавалі пазіцыі ўрадавых войск. Бой прадаўжаўся і ўвечары 17 студзеня. Рэспубліканцы адбілі ўсе атакі мяцежнікаў і ўтрымалі свае пазіцыі.

На паўночным захадзе ад Мадрыда ўрадавымі часцямі занята тэрыторыя, якая прылягае да Карунскай дарогі, у непасрэднай блізасці ад Аравака і Пасуэла дэ Аларкон. Гэта дарога ў частцы, занятай мяцежнікамі, знаходзіцца пад агнём рэспубліканцаў.

Адбываюцца ўпартыя баі і ў сектарах Універсітэцкага гарадка і Манклоа. Усе намаганні мяцежнікаў выцесніць рэспубліканцаў з занятых імі новых пазіцый пацярпелі поўную няўдачу. У часе атак ва Універсітэцкім гарадку мяцежнікі страцілі 1000 чалавек забітымі і раненымі.

У парку Каза дэль Кампо рэспубліканцы занялі дзве вышыні, якія маюць важнае стратэгічнае значэнне.

Бамбардыроўка Барселоны

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 18 студзеня. (БЕЛТА). У ноч на 18 студзеня судно мяцежнікаў бамбардыравала Барселону (сталіцу Каталонскай аўтаномнай вобласці). Па сігналу ўсе агні ў горадзе былі патушаны, і жыхары ў арганізаваным парадку размясціліся ў падрыхтаваных убежышчах.

Карабль выпусціў 30 снарадаў у напрамку да прыстані Сан-Бельтан і падножжа гары, якая пануе над горадам і портам. Батарэі, размешчаныя на гары, адказалі, пасля чаго судно скрылася.

Мяцежнікі імкнуліся, як відаць, пашкодзіць параходы, што стаяць на прычалах каля прыстані Сан-Бельтан, аднак, ні адно судно не пашкоджана. Лёгка ранен кавалкам каменя механік парахода «Кампільо».

Агенцтва Рэйтэр аб адказе совецкага ўрада

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 18 студзеня. (БЕЛТА). Агенцтва Рэйтэр паведамляе: «У Лондане лічаць, што нота совецкага ўрада, якая змяшчае адказ на нядаўні англійскі дэмарш па пытанню аб забароне адпраўкі добраахвотнікаў у Іспанію, з'яўляецца настолькі здавальняючай, наколькі гэта магчыма пры цяперашніх абставінах».

Адказная нота французскага ўрада на англійскую прапанову

ПАРЫЖ, 18 студзеня. (БЕЛТА). Міністэрства замежных спраў апублікавала адказную ноту французскага ўрада на англійскую прапанову — забараніць вярбоўку і адпраўку добраахвотнікаў у Іспанію. Французскі ўрад указвае, што ён патрэбаваў ад парламента паўнамоцтваў, якія-б далі яму магчымасць перашкодзіць вярбоўцы і адпраўцы добраахвотнікаў у Іспанію. Французскі ўрад запэўняе ўрад Англіі, што ён гатоў прымяніць гэтыя меры, калі ўсе іншыя зацікаўленыя дзяржавы абавяжуцца прадпрыняць падобныя-ж меры.

Аднак, французскі ўрад падкрэслівае, што гэтыя меры, без сумнення, будуць мець толькі часовы характар, бо як паказаў вопыт, дзейснасць забарончых мер няпэўна пры адсутнасці сістэмы кантролю. З прычыны гэтага французскі ўрад захоўвае за сабой права перагледзець сваю пазіцыю, калі праз паўны тэрмін пасля правядзення ім указаных вышэй забарончых мер высветліцца немагчымасць ажыццяўлення сістэмы агульнага дзейснага кантролю.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. МАЙСКАГА

НА ПАСЯДЖЭННІ ПАДКАМІСІІ ПРЫ ЛОНДАНСКІМ КАМІТЭЦЕ

ЛОНДАН, 19 студзеня. (БЕЛТА). Учора адбылося чарговае пасяджэнне падкамісіі пры старшыні міжнароднага камітэта па неўмяшанню ў справы Іспаніі. Абмяркоўваліся наступныя пытанні: Аб адказе іспанскага ўрада на прапанову камітэта аб сістэме кантролю, аб пасылцы добраахвотнікаў і аб фінансавай дапамозе.

Па пытанню аб адказе іспанскага ўрада на прапанову камітэта па неўмяшанню аб сістэме кантролю, прадстаўнік СССР Майскі заявіў, што ён лічыць гэты адказ здавальняючым. У сваёй першай ноце, атрыманай камітэтам 22 снежня, іспанскі ўрад згадзіўся ў прынцыпе на ўвядзенне кантролю над выкананнем забароны прывозіць зброю ў Іспанію. У другой ноце ад 7 студзеня, не гледзячы на грубае парушэнне пагаднення аб неўмяшанні Італіяй, высадзіўшай у канцы снежня мінулага года і ў пачатку студзеня бягучага года каля 11 тыс. салдат у Кадыксе ў дапамогу генералу Франко, іспанскі ўрад усё-ж не адмаўляецца ад сваёй першапачатковай пазіцыі, а толькі папярэджвае, што іменна такія факты могуць прывесці да змены пазіцыі рэспубліканскага ўрада Іспаніі, даўшага ў прынцыпе згоду на кантроль, мяркуючы ў той-жа час, што гутарка ішла аб сур'ёзным, дзейсным кантролі.

Улічваючы безупынную пасылку войск зброі генералу Франко з Германіі і Італіі, даны адказ іспанскага ўрада павінен быць прызнан больш чым карэктным. Зусім інакш, аднак, абстаіць справа з адказам генерала Франко.

Члены камітэта, — гаварыў далей Майскі, — несумненна, памятаюць той адказ гэтага карманнага генерала, які абмяркоўваўся 23 снежня. Ён складаўся з раду нахабных пытанняў, звернутых па адрасу камітэта, і Франко не здзіўляў у ім аб прызнанні кантролю нават у прынцыпе. Усё, што ён знаходзіў магчымым «ласкава абяцаць», камітэту, гэта— «прадаўжаць вывучэнне» зробленых камітэтам прапаноў аб кантролі. На другі зварот камітэта ад 1 студзеня ён да гэтага часу не даў адказу, хоць ужо даўно прайшоў дзесяцідзённы тэрмін, устаноўлены камітэтам для атрымання гэтага адказу. Наадварот, іспанскі ўрад, атрымаўшы зварот камітэта 5 студзеня, даў ужо 7 студзеня адказ на гэты зварот. Ёсць шмат падстаў думаць, што Франко чэрпае сваё натхненне для такога беспарамоннага абыходжання з камітэтам у некаторых іншаземных сталіцах, адкуль яму даюцца парады пягнуць з адказам, за сыпаць камітэт кучай пытанняў і затым, урэшце, адмовіцца ад прызнання кантролю. Тым больш прычын для камітэта паставіць усур'ёз пытанне аб ажыццяўленні сапраўднага неўмяшання ў справы Іспаніі і зусім эфектыўнага кантролю на сушы і на моры, незалежна ад пачуццяў і жаданняў генерала Франко. У гэтым цяпер адчуваецца асабліва вострая патрэба, і на гэтым павінны быць зараз сканцэнтраваны галоўныя намаганні камітэта».

Затым падкамісія перайшла да абмеркавання пытання аб адпраўцы добраахвотнікаў у Іспанію, і тут зноў пачалася старая гульня фашысцкіх дзяржаў. Не гледзячы на тое, што на папярэднім пасяджэнні ад 12 студзеня, дзе прадстаўнікі Італіі і Германіі адгаварваліся ад рашэння пытання аб спыненні «валанцёрства» адсутнасцю інструкцыі, і старшыня камітэта лорд Плімут настойліва прасіў іх да наступнага разу атрымаць такія інструкцыі, — яны і на гэтым пасяджэнні «аказаліся» без дырэктыў ад сваіх урадаў. Таму абмеркаванне найбольш вострага пытання зноў было адкладзена.

У канцы пасяджэння разглядалася пытанне аб фінансавай дапамозе, якая можа аказацца іспанскаму ўраду ці Франко. Прадстаўнікі Германіі, Італіі і Партугаліі зноў высунулі патрабаванне налажыць эмбарго на вываз золата іспанскім урадам за граніцу. Прадстаўнік Партугаліі выпусціў кошку з мяшка і прама заявіў, што ён спадзяецца на перамогу Франко і што «калі Франко пераможа», золата яму вельмі прыгадзіцца. Лорд Плімут заняў ухіляючую пазіцыю, прапануючы перадаць абмеркаванне пытання аб золаце на разгляд экспертаў. Прадстаўнікі Германіі, Італіі і Партугаліі неадкладна падхапілі гэту прапанову Плімута.

Майскі катэгарычна заявіў ад імя совецкага ўрада, што пытанне аб іспанскім золаце стаіць па-за кампетэнцыяй камітэта па неўмяшанню, бо гэта пытанне датычыць суверэнітэта іспанскага ўрада. Майскі заявіў таксама, што ён ні пры якіх умовах не можа згадзіцца на перадачу гэтага пытання на абмеркаванне падкамісіі экспертаў. Тут закранута прынцыповае пытанне, зусім выключнай важнасці. Майскі выказаў пры гэтым глыбокае здзіўленне па повод таго, што лорд Плімут, будучы прадстаўніком краіны, якая афіцыяльна прызнае іспанскі ўрад, знаходзіць магчымым ставіць пад пытанне права апошняга распараджацца дзяржаўнымі сродкамі Іспаніі. Лорд Плімут прабаваў апраўдацца, але няўдала. Нарэшце, ён павінен быў канстатаваць, што ў пытаньні аб іспанскім золаце падкамісія зайшла ў тупік. Падкамісія разышлася ў становішчы вялікага разброду, так што не быў нават назначан дзень яе наступнага пасяджэння.

СОВЕЦКІ ПАРАХОД „РИОН" У БАРСЕЛОНЕ

БАРСЕЛОНА (галоўны горад Каталонскай аўтаномнай вобласці), 18 студзеня. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Фабра, капітан совецкага парахода «Рион», даставіўшага харчаванне ў Барселону, будзе прынят главой урада Каталоніі Кампанісам. У Барселоне адбываюцца маніфестацыі, якія сведчаць аб удзячнасці насельніцтва за совецкую дапамогу харчаваннем.

Бамбардыроўка французскага ваеннага судна

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 19 студзеня. (БЕЛТА). Як паведамляюць газеты, учора ў 9 гадзін 30 мін. у моры ля мыса Сан-Себастыяна (Каталонскае ўзбярэжжа Іспаніі), французскі эскадраны мінаносец «Майэ брэзэ» быў атакаван самалётамі невядомай нацыянальнасці. На французскае судно было скінута 5 ці 6 бомб. Аднак, гэтыя бомбы не папалі ў «Майэ брэзэ», і судно змагло прадаўжаць свой рэйс у Тулон (порт на поўдні Францыі). Газеты ўказваюць, што весткі аб гэтай бамбардыроўцы пацвярджаюцца ва французскіх афіцыяльных колах.

Паведамленне агенцтва Рэйтэр

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 18 студзеня. (БЕЛТА). Агенцтва Рэйтэр паведамляе: «Згодна вестак, атрыманых сёння раніцай, у Лондане не разглядаецца пытанне аб уваскрашэнні пакта чатырох дзяржаў (Францыі, Англіі, Германіі і Італіі). У Лондане няма афіцыяльнай інфармацыі аб тым, што пакт чатырох дзяржаў быў прадметам перагавораў паміж Мусаліні і Герынгам».

Германскі „гандаль" з Іспаніяй

БЕРЛІН (сталіца Германіі), 18 студзеня. (БЕЛТА). У артыкуле аб замежным гандлі Іспаніі газета «Франкфуртэр цайтунг» прыводзіць некаторыя даныя аб гандлёвых адносінах Германіі з іспанскімі мяцежнікамі.

«Германскі гандаль з Іспаніяй, — піша аўтар,—азначае, разумеецца, толькі гандаль з захвачанымі генералам Франко раёнамі». У гэтых раёнах аўтар адзначае «ажыўленне» гандлю.

Трэба адзначыць, што ў той час, як паводле афіцыяльных даных германскай статыстыкі з ліпеня па лістапад 1936 г. Германія вывезла з захвачаных генералам Франко раёнаў 175 тыс. тон жалезнай руды, 47 тыс. тон сернага калчадана, 23 тыс. тон лесу і т. д., статыстыка германскага вывазу ў Іспанію ўказвае толькі адну здзелку за ўвесь гэты час: 832 аўтамабілі. Узнікае пытанне, чым-жа «кампенсаваўся» астатні германскі імпарт?

Аўтар артыкула, таксама як і германская статыстыка, пакідае гэта пытанне адкрытым.

Новы правал германскай прапаганды супроць Чэхаславакіі

ПРАГА (сталіца Чэхаславакіі), 17 студзеня. (БЕЛТА). Газеты канстатуюць, што германская прапаганда супроць Чэхаславакіі правалілася. Орган чэшскіх сацыялістаў «Чэшске слово» піша: «Тыя, якія пісалі аб совецкіх аэрадромах у Чэхаславакіі, самі ведаюць, што гэта сцвярджэнне—проста выдумка. Адзіная, хто гэтага не ведае і не смее ведаць—гэта германская грамадскасць, для якой кампанія супроць Чэхаславакіі і было прадпрынята. Сістэматычныя ўзбраенні Германіі, прывёўшыя да таго, што ў немцаў ёсць гарматы, але няма масла, могуць быць апраўданы ў вачах германскай грамадскасці, толькі захавэннем відочнасці таго, што Германіі пагражае небяспека з боку яе суседзяў. З тэй прычыны, што Чэхаславакія з яе 15-мільённым насельніцтвам не можа ўсур'ёз прадстаўляць сабой пагрозу Германіі з 70-мільённамі насельніцтва, германскае міністэрства прапаганды выдумала казку аб «совецкіх аэрадромах у Чэхаславакіі».

Парушэнне польскімі пагранічнікамі польска-літоўскай граніцы

КАУНАС (сталіца Літвы), 17 студзеня. (БЕЛТА). Літоўскае агенцтва паведамляе: «Начальнік польскага пагранічнага раёна адмовіўся прыняць прапанову начальніка літоўскага пагранічнага раёна — паладзіць сустрэчу для таго, каб урэгуляваць інцыдэнт на літоўска-польскай граніцы. Начальнік літоўскага пагранічнага раёна паўтарыў сваё патрабаванне аб сустрэчы. Інцыдэнт адбыўся ў ваколіцах возера Дукштас за 39 кілометраў на поўдзень ад латвійскага горада Даугаўпілс (Дзвінск) на лініі, якая вядзе к г. Вільно. Літоўскі ўрад звярнуўся да насельніцтва з заклікам захоўваць спакой».

Хваля забастовак у Польшчы нарастае

Параўнанне статыстычных даных аб забастовачным руху ў Польшчы за 1935 і 1936 гг. паказвае велізарны рост колькасці забастовак і ўдзельнікаў іх у мінулым годзе.

Надзвычай цяжкае матэрыяльнае становішча рабочых на прадпрыемствах Польшчы, няўхільнае зніжэнне заработнай платы, сваволле гаспадароў выклікаюць забастоўкі на сотнях заводаў і фабрык.

Калі ў першым квартале 1935 года ў Польшчы было зарэгістравана 221 забастоўка, пры чым у стачках прымалі ўдзел 152.451 рабочых, дык у другім квартале было ўжо 294 забастоўкі з 157.818 удзельнікаў. У першым-жа квартале 1936 года было зарэгістравана 312 забастовак з 234.763 удзельнікаў. (Ул. інф.).

У ПРАКУРАТУРЫ САЮЗА ССР

У сучасны момант органамі НКУС закончана следства па справе трацкісцкага «паралельнага цэнтра» ў складзе **Пятакова Ю. Л. (Г. Л.), Радэка К. Б., Сакольнікава Г. Я. і Серэбракова Л. П.**, арганізаванага ў 1933 г. па ўказаннях **Л. Троцкага**, які знаходзіцца ў эміграцыі, побач з існаваўшым трацкісцка-зіноўеўскім цэнтрам у складзе **Зіноўева, Каменева, Смірнова, Мрачкоўскага** і інш.

Следствам устаноўлена, што «паралельны цэнтр», паводле прамых указанняў **Л. Троцкага**, арганізаваў дыверсійныя і тэрарыстычныя групы, ажыццявіўшыя на радзе прадпрыемстваў, асабліва маючых абаронае значэнне, школьніцкія і дыверсійныя (падрыўныя) акты і падрыхтоўваўшыя тэрарыстычныя акты супроць кіраўнікоў ВКП(б) і совецкага ўрада. Гэтыя-ж групы, згодна прамых указанняў **Л. Троцкага** і «паралельнага цэнтра», ажыццяўлялі і шпіянаж на карысць некаторых замежных дзяржаў.

Следствам устаноўлена, што злачынная дзейнасць «паралельнага цэнтра» і іншых членаў трацкісцкай арганізацыі, прыцягнутых па данай справе ў якасці абвінавачваемых, была накіравана на падрыў ваеннай магутнасці СССР, паскарэнне ваеннага нападу на СССР, садзейнасць замежным агрэсарам у захваце тэрыторыі і расчляненні СССР, на звяржэнне совецкай улады і аднаўленне ў Совецкім Саюзе капіталізма і панавання буржуазіі.

Па справе да судовай адказнасці прыцягваюцца: **Пятакоў Ю. Л. (Г. Л.), Радэк К. Б., Сакольнікаў Г. Я., Серэбракоў Л. П., Мураладаў Н. І., Ліўшыц Я. А., Дробніс Я. Н., Багуслаўскі М. С., Князеў І. А., Ратайчак С. А., Норкін Б. О., Шэстоў А. А., Страілаў М. С., Турок І. Д., Грашэ І. І., Пушын Г. Е. і Арнольд В. В.**

Абвінавачванне заключэнне зацверджана пракурорам Саюза ССР і накіравана са справай у ваенную калегію Вярхоўнага суда СССР для разгляду ў адкрытым судовым пасяджэнні.

Справа слуханнем у ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР назначана на 23 студзеня г. г. (БЕЛТА).

Пагранічнікі-дынамаўцы—удзельнікі велапрабегу ўздоўж граніц СССР—прыбылі ў Менск

Іх пяць смелых і адважных слаўных сыноў нашай радзімы — камандор прабегу Людмірскі, удзельнікі прабегу Шубін, Радзевіч, Тімафееў і Мораў. Мужнасць, адвагу і ўпартае жаданне ў дасягненні сваёй мэты ў іх выхавала партыя Леніна—Сталіна, наша прыгожая, магутная радзіма, яны загартавалі яе ў пагранічных часцях на жалезных традыцыях Фэлікса Дзержынскага.

Гэта слаўная пяцёрка пагранічнікаў-дынамаўцаў, якія прайшлі ўжо на веласіпедах 29388 кілометраў цяжкага шляху ўздоўж граніц СССР, учора ў 23 гадзіны прыбылі ў сталіцу ордэнаноснай БССР. Сустракаць іх прышлі намеснік наркома НКУС БССР тав. Кэруцкі, начальнік УПВО НКУС БССР камбрыг Емельянаў, сакратар ЦК ВЛКСМ тав. Аўгустайціс, камандаванне пагранічных часцей, байцы-пагранічнікі, прадстаўнікі спартыўных арганізацый і іншыя.

Адважных удзельнікаў гераічнага прабегу пагранічнікі сустрэлі грамавым «ура», якое заглушыла гукі аркестра. Кароткі мітынг. З прывітаннямі выступаюць ад пагранічнікаў-дынамаўцаў камбрыг Емельянаў, ад ЦК ЛКСМБ і камітэта па справах фізкультуры і спорту пры СНК БССР тав. Кузняцоў, ад ЦВК БССР тав. Град, ад гаркома партыі, горсовета і гаркома ЛКСМБ т. Драбышэўскі.

Слова прадастаўляецца камандору бясприкладнага ў гісторыі веласіпеднага прабегу т. Людмірскаму.

— Старт гэтаму прабегу (на дыстанцыю ў 30060 кілометраў уздоўж граніц СССР) быў дан у г. Кіеве ў дзень 15-годдзя войск пагранічнай і ўнутранай аховы НКУС СССР, 15 лютага мінулага года, — гаворыць ён. — Наш прабег прысвячаецца гэтаму слаўнаму 15-гадоваму юбілею пагранічнікаў. Пачынаючы яго, мы паставілі перад сабой такія мэты: паказаць адвагу і выпослівасць пагранічнікаў і ўсіх совецкіх людзей, якія ўмеюць перамагаць усякія перашкоды.

— Сусветны рэкорд па дальнасці прабегу на веласіпедах мы пабілі яшчэ 21 ліпеня мінулага года, калі прайшлі больш 15.110 кілометраў,—гаворыць тав. Людмірскі. Далей ён расказвае ў якіх непамерна цяжкіх умовах праходзіў прабег. Веснавая распуціца на Украіне, горныя пад'ёмы і дзесяткі разлітых бурлівых горных рэчак на Каўказе, праз пяскі Каракумаў, на Бухару, Фрунзе, Чэрэмхава, Гродэкава, Уладзівасток — такі быў шлях да далёкаўсходніх граніц нашай радзімы.

У Уладзівастоку каманда павярнула на Краснаярск, а адтуль на захад, да заходніх граніц краіны Совецкаў.

— З першага дня старту, — заканчвае свой хвалюючы расказ тав. Людмірскі, — нас не пакідала думка аб перамозе і мы ў гэтым цвёрда ўпэўнены...

Сёння раніцай удзельнікі гераічнага велапрабегу ўздоўж граніц СССР накіроўваюцца на Кіеў. **Н. ВІШНЕЎСКІ.**

У АДКАЗ ПАНУ ВАЛЕЎСКАМУ

15 студзеня г. г. я прачытаў у «Правде» аб тым, што дэпутат польскага сейма пан Валеўскі выступіў з паклёпніцкімі выпадамі супроць Совецкага Саюза. «Надзвычай цяжкі лёс пялякаў, якія жывуць у Совецкім Саюзе», — плача Валеўскі. Я чытаў гэтыя радкі і чуў у іх сабачую брэхню. Так нагла хлусіць могуць толькі людзі, страціўшыя ўсякае сумленне. Таму я не крыўджуся на пана Валеўскага. Ён мне нагадвае пайманага злодзея, які крычыць «трымай злодзея».

Усяму свету вядома, як цяжка жывецца працоўным Польшчы. Сам дэпутат сейма Грабоўскі заявіў, што польскія турмы перапоўнены. Сучасная Польшча праславілася яўрэйскімі пагромамі. І нядзіўна, што верны фашысцкі пёс Валеўскі крычыць «трымай злодзея».

На самой справе, што агульнага паміж наглым абураючым заяўленнем фашысцкага служакі Валеўскага і сапраўдным жыццём палякаў у Совецкім Саюзе. Палякам, як і ўсім нацыянальнасцям, прадастаўлены ў нас усе магчымасці шчасліва жыць, працаваць, праяўляць сябе ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага жыцця краіны.

Я сам па нацыянальнасці паляк. Мне 53 гады. Прайшоў цяжкую школу працы на капіталістычных прадпрыемствах. Калі мне было 16 год, я паступіў у ліцейную на менскі завод Якабсона, потым працаваў у Маскве. Царская Расія сапраўды была для нацыянальных меншасцей мачахай. Памятаецца такі факт. У 1898 годзе я падаў заяву аб паступленні ў Менскую губернскую друкарню. Мяне не прынялі, бо я паляк.

І толькі пры совецкай уладзе, у нашым родным СССР, усе народы і нацыянальнасці карыстаюцца аднолькавымі правамі. Адкрыйце вашы вочы, паны Валеўскія, і вы ўбачыце ва ўсёй нашай Совецкай краіне польскія навучальныя ўстановы, дзе вучацца на даяржаўныя сродкі сотні тысяч дзяцей палякаў. Далёка за прыкладамі хадзіць не трэба. Мой сын Феліцыян скончыў польскую школу, потым скончыў хіміка-тэхналагічны інстытут і цяпер працуе інжынерам на шклозаводзе г. Барысава.

У Менску выходзіць газета «Орка», ёсць польскі педагагічны тэхнікум, польскія школы, дзіцячыя дамы.

Праца ў СССР радзіна для палякаў, як і для іншых нацыянальнасцей. У нас на заводзе працуюць дзесяткі рабочых-палякаў, сярод іх майстар рамонтнага цэха Паўлоўскі, і ўсе дружнай сям'ёй разам з беларусамі, рускімі і яўрэямі працуюць на карысць нашай сацыялістычнай радзімы. Вось ужо семнаццаць год, як я працую мэйстрам ліцейнага цэха.

Гэтыя факты можна памножыць на прыкладах жыцця ўсіх палякаў Совецкага Саюза. Я іх прывёў не для таго, каб пан Валеўскі зразумеў, як глупа і мерзка ён выступіў. Ён гэта ўсё роўна не зразумее.

Я хацеў-бы, каб гэтыя словы дайшлі да працоўных Польшчы, якія з надзеяй і любоўю глядзяць на Совецкі Саюз — радзіму працоўных усяго свету.

Для нас, палякаў, грамадзян Совецкага Саюза, няма і не можа быць нічога даражэй, чым наша сацыялістычная радзіма—СССР.

ЛОСКАТ Владзіслаў Вацлававіч — начальнік ліцейнага цэха менскага варштатабудаўнічага завода імя Варашылава.

НАХАБНАЯ ХЛУСНЯ

Дакументы і артыкулы прымаюцца людзьмі па-рознаму. Пан Валеўскі разлічваў, як відаць, не на совецкіх чытачоў, калі гаварыў сваю прахову аб нібы дрэнным жыцці палякаў у СССР. Але прачыталі яе і ў Саюзе. Прачыталі палякі-калгаснікі. Доўга пасля гэтага яны трымаліся за жываты, пакатваючыся са смеху. Умарыў калгаснікаў 4 брыгады калгаса імя «9 студзеня», Дзяржынскага раёна, пан Валеўскі.

Ды і як не смяяцца, калі бачыш, як пан занадта хлусіць. Калгаснікі-палякі, дружна жывуць з рускімі, беларусамі і яўрэямі, працуюць побач з імі, карыстаюцца аднолькавымі правамі з усімі грамадзянамі, радуюцца разам з усімі працоўнымі СССР новай Канстытуцыі і свайму шчаслівому заможнаму жыццю.

У калгасе «9 студзеня» няма ні адной сям'і, якая не мела-б адну-двух кароў, авечак і свіней. У вёсцы Кліпаўшчына, на тэрыторыі якой знаходзіцца калгас, у часе польскай акупацыі быў толькі адзін пісьменны селянін. А цяпер тут няма непісьменных. Дзеці калгаснікаў вучацца на сваёй роднай мове ў пачатковых, сярэдніх і вышэйшых школах. Дзеці многіх сялян гэтай вёскі працуюць на адказных пасадах. Зубовіч Вітальд працуе раённым пракурорам, Зубовіч Эдвард стаў чырвоным лейтэнантам.

Але смех скончыўся. Скончылася абурэнне. Да якога часу польскія паны будуць паклёпнічаць на Совецкі Саюз, да якога часу яны будуць хлусіць польскім рабочым, сялянам аб нашым жыцці? — думалі калгаснікі.

Нявольна пачаўся сход.

Старэйшыя калгаснікі тт. Трусевіч, Сцефановіч і інш. на сходзе гаварылі аб шчаслівым і радасным жыцці ў калгасе, дзе ў адной дружнай сям'і працуюць палякі і беларусы, рускія і яўрэі, татары і мад'яры. Яны напомнілі сабраўшымся аб жудасных днях белапольскай акупацыі, калі польскія жандары бязлітасна расправяліся з беларускімі і польскімі сялянамі.

У сваёй рэзалюцыі яны заяўляюць, што паклёп польскіх фашыстаў не спыніць іх, яны будуць як і зараз будаваць сацыялізм сумесна з усімі працоўнымі СССР.

Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка, — гаворыцца далей у іх рэзалюцыі, — якая ажыццяўляецца ў СССР пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна, забяспечыла працоўным усіх нацыянальнасцей Совецкага Саюза, у тым ліку і нам, палякам шчаслівае заможнае жыццё, самыя шырокія дэмакратычныя правы.

Не ступіць больш панам фашыстам на нашу калгасную зямлю! Мы ўсе, як адзін, станем на абарону нашай шматнацыянальнай сацыялістычнай радзімы і ўшчэнт разаб'ем усіх яе ворагаў, — так заканчваюць калгаснікі-палякі свой адказ пану Валеўскаму.

І. С.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ЗА РЭКОРДНЫ УРАДЖАЙ У ДРУГІМ СТАХАНАЎСКІМ ГОДЗЕ

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ НА СПРАВЕ

Калгас «Чырвоная зорка», Барысаўскага раёна, абавязаўся атрымаць у 1937 годзе сярэдні ўраджай па калгасу: па зернавых культурах на плошчы ў 548 гектараў па 15 цэнтнераў з гектара, па бульбе на плошчы 125 гектараў па 200 цэнтнераў з гектара і па ільну на плошчы 34 гектары па 5 цэнтнераў ільновалакна.

У калгасе вылучаны рэкордныя ўчасткі, на якіх намечана атрымаць: па зернавых на плошчы 10 гектараў па 40—45 цэнтнераў з гектара, па бульбе на плошчы 18 гектараў па 500 цэнтнераў з гектара і на плошчы ў 2 гектары па 800—1000 цэнтнераў з гектара, па ільну на плошчы 3 гектары па 10 цэнтнераў ільновалакна. Калгас мае ўжо некаторы вопыт атрымання высокіх ураджаяў. У 1936 годзе на рэкордным участку было атрымана па зернавых культурах 28 цэнтнераў з гектара і па бульбе 536 цэнтнераў з гектара.

Каб забяспечыць высокі ўраджай, калгаснікі ўзяліся ўгноіць 400 гектараў яравога поля. 75 гектараў будуць засеяны чыстагатунковым насеннем аўса, ячменю і пшаніцы.

Пасля прыняцця абавязацельства не прайшло яшчэ і аднаго месяца. У калгасе вывезена на поле 270 тон торфу і 230 тон гною. Торф, які вывозіцца на поле, складаецца ў штабялі правільнай формы, пераслайваецца з гноем і добра ўтрамбоўваецца. У першую чаргу па вывазцы ўгнаення працуюць створаныя ў калгасе 5 рэкордных звенняў. На чале звенняў пастаўлены лепшыя стахановцы калгаса: Багдановіч, Калячонак Зося, Навіцкая Лёкса, Яловік Ядвіга і Мірук Фёдар.

Сёлета ўпершыню калгас заняўся скарыстаннем на ўгнаенне фекальных мас. Асаблівую ініцыятыву ў гэтым праяўляе агароднік калгаса т. Мірук Нікалай, які заклаў ужо некалькі торфафекальных куч. У кожнай брыгадзе і звяне прахо́дзіць збор попелу і птушынага памёту. Не толькі ў хаты калгаснікаў, але і ў памяшканні школы, сельсавета, калгаснай электрастанцыі прыходзяць калгаснікі і збіраюць попел. Калгас прывёз з чыгуначнай станцыі 16,5 тоны суперфасфату.

У калгасе поўнасцю закончан рамонт сельскагаспадарчага інвентару. Адремонтавана 57 параконных, 12 аднаконных плугоў, 60 боран «зігзаг», 55 калёс, дзве радковыя сеялкі і інш. інвентар. Поўнасцю падрыхтавана вупраж для 80 рабочых коней: хамуты, новыя пастромкі, лейцы. Усё гэта дагнана да кожнага каня. У канюшні пабудавана спецыяльная сушыльня, дзе прасушваецца вупраж.

Калгас крыху адстаў з ачысткай насення зернавых праз трыер, але і гэта работа зараз разгорнута і будзе хутка скончана.

Загадчык калгаснай хаты-лабараторыі т. Курковіч Майсей рэгулярна праводзіць заняткі агранамічнага гуртка. Каля 30 калгаснікаў тры разы ў тыдзень збіраюцца для вывучэння агратэхнікі. Правядзімыя заняткі ўвязваюцца з тымі даследчымі данымі, якія атрыманы калгасам у мінулым годзе на рэкордных участках і на даследчых дзялянках.

Разам з іншымі калгасамі сельсавета калгаснікі «Чырвонай зоркі» рыхтуюцца да правядзення сельсавецкай канферэнцыі ўдзельнікаў аграгурткоў. Канферэнцыя пакажа наяўна, якія ўжо поспехі атрыманы кожным аграгуртком, хто лепш з калгаснікаў займаецца і т. д.

Калгаснікі не толькі па-стахановску працуюць у брыгадах, але ў вольны час прымаюць удзел у розных гуртках самадзейнасці калгаса. Звеннявая Калячонак Зося пасля дзённай работы па збору і вывазцы ўгнаення ўвечары ідзе вучыцца ў вячэрнюю сярэднюю школу або займаецца ў балетны гурток. Яна адна з лепшых удзельніц балетных і фізкультурных выступленняў, якія часта арганізоўваюцца на сцэне калгаснага клуба.

Н. ГЛУХ.

З УЗДЫМАМ РЫХТУЮЦЦА ДА СЯЎБЫ

ЧАВУСЫ. У раёне арганізаваны дзесяткі стахановскіх звенняў і брыгад, якія ўзялі на сябе абавязацельства дабіцца не менш 13—15 цэнтнераў ільновалакна з рэкордных участкаў і не менш 5—6 цэнтнераў валакна ў сярэднім з усіх пасеваў ільну.

Калгас «Новае жыццё», Антонаўскага сельсавета, у 1936 годзе атрымаў у сярэднім 4,5 цэнтнера ільновалакна з гектара, а з рэкордных участкаў звыш 10 цэнтнераў. Уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва, калгаснікі паставілі перад сабой задачу дабіцца з плошчы ў 16 гектараў па 8 цэнтнераў ільновалакна ў сярэднім, з рэкордных участкаў—па 13—15 цэнтнераў, а з астатніх участкаў — па 5—6 цэнтнераў валакна з гектара. У калгасе ўжо арганізаваны 9 стахановскіх звенняў.

З вялікім уздымам ідзе падрыхтоўка да вясны. Насенне поўнасцю ачышчана, засыпана і хаваецца ў добрым памяшканні. Калгас закупіў і вывез мінеральнае ўгнаенне. Калгаснікі разгарнулі збор попелу і курынага памёту. Звяно знатнай тысячніцы Маханенкавай сабрала 9 цэнтнераў курынага памёту, 8 цэнтнераў попелу; звяно Елізаветы Гарбачэнка сабрала 4 цэнтнеры курынага памёту, 6 цэнтнераў попелу. Звяно Алёны Гарбачэнка сабрала 3 цэнтнеры курынага памёту і 8 цэнтнераў попелу. Іх прыкладу паследвалі астатнія звенні. Зараз пачалі сушыць памёт.

Увесь актыў калгаса рэгулярна наведвае гурток агратэхвучобы пры Антонаўскім сельсавеце.

БЕРАЗОЎСКАЯ.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ СЛУЦКАЙ МТС

Совет Слуцкай МТС абмеркаваў зварот удзельнікаў пашыранага пленума зернавой секцыі Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя В. І. Леніна. Уключаючыся ва ўсесаюзнае спаборніцтва за высокі ўраджай, совет МТС у цэлым і кожны старшыня калгаса разам з агратэхнічнымі работнікамі бяруць на сябе наступныя абавязацельствы:

Арганізаваць не менш аднаго звяна ў кожным калгасе па атрыманню не ніжэй 50 цэнтнераў зярна, 500 цэнтнераў бульбы і звыш 10 цэнтнераў ільновалакна з гектара.

Дабіцца сярэдняга ўраджаю па калгасах МТС не менш 18 цэнт. зернавых і не менш 200 цэнт. бульбы. Для гэтага скарыстаць усе віды мясцовага ўгнаення.

Кожны агранам МТС бярэ на сябе абавязацельствы па аказанню пастаяннай дапамогі звеням стахановскіх участкаў не менш, як у 3 калгасах.

Прэзідыум совета МТС: КУКСЕНАК, СТАШЭНІН, КАЛЕЧЫЦ, ГУРБО, ШЫШКО, АЖЭУСКІ, ТРАХІМОВІЧ, ПІЛЬКО.

Старшыня калгаса імя Галадзеда, Крыўчонскага сельсавета, Брагінскага раёна, т. Кацюн Т. І. і кладаўшчык Гурэвіч М. О. правяраюць насенне, падрыхтаванае для сяўбы. Фото Цалуйка.

У КАЛГАСЕ ОРДЭНАНОСЦАЎ

ТУРАЎ. (**«Кар. «Звязды»**). Дзень 6 студзеня калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імя Варашылава адзначалі, як выдатную гістарычную дату ў сваім жыцці. Летась у гэты дзень яны ўрачыста сустракалі свайго старшыню Блоцкага Міхася і радавога калгасніка Юхневіча Мацвея, якія вярталіся з усесаюзнай нарады перадавікоў ураджайнасці ордэнаносцамі. Вышэйшая ўрадавая ўзнагарода выклікала тады ў калгаснікаў пачуццё вялікай радасці і разам з гэтым натхнула іх на яшчэ большую энергічную барацьбу за высокі сталінскі ўраджай. У адказ на ўзнагароду ўрада варашылаўцы абавязаліся змагацца за ўсямернае павышэнне ўраджайнасці сваіх калгасных палёў.

Мінулы 1936 стахановскі год паказаў, што ўзятае абавязацельства калгаснікі выконваюць паспяхова. Аб гэтым красамоўна гавораць лічбы высокага ўраджаю зернавых культур, асабліва азімай пшаніцы. У сярэднім з кожнага гектара пшаніцы калгас атрымаў 100 пудоў зярна. Асобныя ўчасткі далі 150—200 пудоў з гектара. Ураджай жыта таксама быў нядрэнны. У сярэднім кожны гектар даў 78 пудоў, а на асобных участках да 100 пудоў з гектара.

Пры размеркаванні ўраджаю калгаснікі атрымалі на працадзень па 2,5 кілограма зернавых, у тым ліку пшаніцы больш чым паўтара кілограма. Гэтай культуры менш чым 50 пудоў ні адна калгасная сям'я не атрымала. Асобныя сем'і як Якубоўскага Салаўя, Рай Антося, Чарнушэвіча Сцяпана і інш., атрымалі больш чым па 100 пудоў.

Заможнае калгаснае жыццё натхняе калгаснікаў на яшчэ большы вытворчы энтузіязм. Рыхтуючыся да большэвіцкай вясны другога стахановскага года, варашылаўцы паставілі перад сабой задачу: дабіцца яшчэ большага ўраджаю. Абмеркаваўшы звароты ўдзельнікаў пленумаў зернавой секцыі Акадэміі навук і калгаснікаў сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны партызан», Менскага раёна, варашылаўцы ўзялі новыя абавязацельствы — змагацца ў 1937 годзе за 16 цэнтнераў з гектара жыта, 25 цэнтнераў пшаніцы, 22 цэнтнеры ячменю, 25 цэнтнераў аўса, 7 цэнтнераў ільносемя, 5 цэнт. ільновалакна.

Каб з поспехам ажыццявіць гэтыя абавязацельствы, калгаснікі ўжо разгарнулі большэвіцкую работу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. На сёнешні дзень калгас поўнасцю засышаў і добраякасна ачысціў насенне ўсіх культур. Зярно захоўваецца ў добра прадэзінфектаваным амбары. Праведзен абмен гатункова ячменю. Ударным тэмпам праводзіцца рамонт плугоў, барон і іншага сельскагаспадарчага інвентару. Калгасная кузня працуе з поўнай нагрузкай. Распачата вывазка гною з калгасных хлявоў непасрэдна на поле. Улічваючы вопыт мінулага года па ўжыванню на ўгнаенне торфу, калгаснікі абавязаліся сёлета загатовіць і закампаставаць яго не менш 200 тон. Зараз калгас загатаўляе торф, таксама разгарнуўся збор попелу. Гэту работу праводзяць галоўным чынам жанчыны.

Як і ў мінулым годзе, варашылаўцы выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва па падрыхтоўцы да сяўбы калгаснікаў суседняй сельскагаспадарчай арцелі «Прагрэс». Заключан ужо сонцагавор. Разгарнулася і ўнутрыкалгаснае спаборніцтва. Брыгады заключылі таксама паміж сабою дагавары. Сёлета ўпершыню арганізоўваюцца ў калгасе звенні высокага ўраджаю, якія будуць мець свае невялікія ўчасткі. Адно з такіх звенняў узначаліў ордэнаносец Юхневіч, які пакажа ўзоры большэвіцкай работы на калгаснай вытворчасці.

ФРАЛОЎ.

СТАХАНАЎСКІ БУДЗЕ ЎРАДЖАЙ

У калгасным клубе сабраліся члены праўлення і актыў калгаса «Чырвоны гароднік», Прыгараднага сельсавета, Менскага раёна, каб абмеркаваць зварот калгаснікаў і калгасніц сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны партызан», Падгайскага сельсавета, спецыялістаў сельскай гаспадаркі Менскага раёна і Наркамзема БССР.

Старшыня калгаса тав. Касмылёў, удзельнік усебеларускай нарады перадавікоў ураджайнасці, чытаючы абавязацельствы чырвоных партызанаўцаў, дадаў:

— Вось бачыце, яны нас абагналі па многіх культурах. Напрыклад, ячмень у іх даў 165 пудоў, а ў нас менш — 160. Па зернавых культурах сярэдні ў іх ураджай 105 пудоў з гектара, а ў нас — 100 пудоў. Мы мала адсталі ад перадавога калгаса, але трэба ўлічыць, што ў нас значна большыя магчымасці. У нас ёсць усе ўмовы, каб лепш угнаіць глебу і атрымаць большы ўраджай.

— Мы кандыдаты на ўсесаюзную выстаўку. Нам трэба будзе паказаць экспанаты 1936—1937 гадоў. Вось чаму мы сёння абавязаны дэтальна абмеркаваць гэты зварот, адшукаць усе шляхі і сродкі для атрымання сталінскага ўраджаю, з тым, каб заваяваць права на ўдзел у выстаўцы і пры гэтым свае экспанаты паказаць не толькі ва ўсебеларускім павільёне, а ва ўсесаюзным.

У нас расце вельмі высокае жыта, ячмень і авёс. Спябло гоніць ўгару, а колас слабы, неўмалотны, — кажа тав. Лапкоўскі. — І мы самі віноўны ў гэтым. Фекаліі багаты азотам, але мы яго не скарыстоўваем як след.

Брыгадзір Ткачоў абавязаўся ўгноіць два гектары торфафекаліямі і атрымаць па 250 пудоў ячменю з гектара.

У калгасе быў зусім нізкі ўраджай жыта. У мінулым годзе ў сярэднім з гектара знята па 9 цэнтнераў. Калгаснікі ўскрылі прычыну нізкага ўраджаю.

— У нас адсяўное жыта. У іншых-жа калгасах, як правіла, жыта сеецца на папары. Расчыняюцца ўгнаенні, глеба адпачывае і, вядома, атрымліваецца высокая ўраджайнасць, — кажа калгаснік тав. Чарняўскі. — Нам абавязкова трэба практыкаваць падкормку жыта і, па-мойму, лепш за ўсё калійнай селітрай. Яна добра расчыняецца і ўпітваецца ў глебу.

Калгаснік Гамбіцкі востра ставіць пытанне адносна ранняй сяўбы. Ранняя сяўба, — гаворыць ён, — заўсёды сябе апраўдвае. Калі мы будзем гэта выконваць на практыцы, ды яшчэ добра апрацуем глебу, угноім яе і пасевы, як гэта трэба, безумоўна, будзе высокі ўраджай.

— Я згодзен з тым, што трэба ўжываць падкормку, але трэба ведаць як яе праводзіць і калі. Падкормку трэба рабіць з самай ранняй вясны, як толькі выйдзе снег, — сказаў у заключэнне тав. Гамбіцкі.

Пасля шырокага абмену думкамі удзельнікі пашыранага пасяджэння праўлення вызначылі ўраджай, якога павінен дабіцца калгас у гэтым годзе.

Камандзіры калгаснай вытворчасці аднадушна прышлі да высновы, што ў іх калгасе ёсць усе ўмовы, каб дабіцца не менш як па 155 пудоў з гектара ўсіх зернавых культур.

Брыгады Ткачова і Мухлі Галі вылучылі ўчасткі, з якіх абавязаліся атрымаць па 3.000 — 4.000 пудоў бульбы. Каб дабіцца такога ўраджаю, калгаснікі рашылі перамяніць насенне бульбы за высокаякасны гатунак «Эпікур» і засеяць на тарфяным кампосце.

Па гародніне намечана дабіцца не менш, як па 500 цэнтнераў з гектара, 600 цэнтнераў капусты, 400 цэнтнераў гуркоў, 400 цэнтнераў памідораў і т. д.

З 20 гектараў калгас мяркуе зняць па 160 пудоў аўса, з шасці гектараў па 250 пудоў ячменю і з 16 гектараў па 245 пудоў азімай пшаніцы.

Калгаснікі рашылі ў адзнаку ўсесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва за сталінскі ўраджай даць пролетарскім цэнтрам да першага мая маладую цыбулю, бурачкі, шчавель, гуркі, радзіску і салат, а да 15 чэрвеня памідоры. Для вырошчвання ранняй маладой гародніны пачалі будаваць новую вялікую цяплічу.

Каб атрымаць намечаны ўраджай, на закупку мінеральных угнаенняў калгас асігнаваў 2.000 рублёў, апрача гэтага рашылі вывезці на поле яшчэ 2.000 тон гною, з якіх ужо вывезена 1.500 тон, сабраць дзве тоны попелу, закампаставаць 100 тон торфу з гноем, арганізаваць збор гнаёвай жыжы, яшчэ раз прапусціць праз трыер насенне і добра яго захаваць.

Стахановцы калгаса заявілі, што яны ва ўсесаюзным спаборніцтве барацьбы за сталінскі ўраджай не адстануць ад перадавых калгасаў. Яны прапанавалі праўленню арганізаваць у калгасе агратэхнічную вучобу, запрасіць навуковых работнікаў Наркамзема аказваць сталую дапамогу ў вучобе і практычнай рабоце.

Калгас «Чырвоны гароднік» выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва суседні калгас «Адраджэнне».

АЛ. ПАЛЯВЫ.

НЕ МЕНШ 200 ГЕКТАРАЎ НА КАМБАИН

Мы, курсанткі менскай школы трактарыстаў-камбайнераў, горача вітаем адозву ўсебеларускай нарады дзяўчат-трактарыстак «Да ўсіх дзяўчат-трактарыстак, камбайнерак і ільноперабільшчыц, да ўсіх маладых калгасніц ордэнаноснай Совецкай Беларусі».

Мы цалкам падтрымліваем усе мерапрыемствы, высунутыя нарадай па расшырэнню стахановскага руху сярод дзяўчат, якія працуюць у сельскай гаспадарцы, за высокапрадукцыйнае скарыстанне складанай сельскагаспадарчай тэхнікі.

Толькі ў нашай краіне, краіне з самай дэмакратычнай у свеце канстытуцыяй, нам, жанчынам, роўна з мужчынамі даны ўсе правы для работы, вучобы, для шчаслівага і радаснага жыцця.

У нашай школе навучаецца зараз сто дзяўчат-калгасніц. Мы добра ведаем, што хуткі рост і развіццё буйнай сацыялістычнай гаспадаркі БССР, велізарны машынатрактарны парк яе патрабуюць высокакваліфікаваных, палітычна пісьменных і культурных камандзіраў машын. Таму зараз уся наша ўвага звернута на вучобу. Скончыць школу толькі на «выдатна» — вось задача, якая зараз стаіць перад намі.

Сярод нас ёсць дваццаць пяць выдатнікаў вучобы, як Жыдовіч, Шарко, Валодзькіна, ордэнаноска Мандрукевіч, Сяргейчык, Думанская і інш.

Мы абавязваемся дапамагчы курсанткам тт. Вольскай і Лабачэўскай, якія малапісьменны і вучацца толькі на здавальняюча, выйсці ў рады выдатнікаў. Курсанткі Селістровіч і Нрынкевіч прышлі на курсы з вельмі малой асветай, аднак, дзякуючы сваёй стараннасці і напорыстасці ў вучобе, здаюць дысцыпліны па «выдатна».

Мы не забываем таксама аб тым, што кожны грамадзянін совецкай краіны павінен мацаваць яе абароназдольнасць. Абяцаем, што да выпуску школы не будзе ні аднаго курсанта без значка ГСА і ПВХА.

Школа наша скончыць сваю работу 1 мая г. г. і мы, курсанткі, атрымаем ганаровую і адказную работу — працаваць на камбайнах і трактарах. Выклік нарады жанчын-трактарыстак — даць не менш 1.000 гектараў на кожны трактар, на якім працуе дзяўчына — прымаем і з гонарам будзем змагацца за выкананне яго ў 1937 годзе. Абяцаем на кожным паўночным камбайне выпрацаваць не менш 200 гектараў, а нашы выдатнікі абавязваюцца выпрацаваць па 300 гектараў.

Выклікаем па выкананню гэтых абавязкаў на сацыялістычнае спаборніцтва курсантаў Горацкай школы трактарыстаў-камбайнераў.

Па даручэнню схода: ШАРКО, ДУМАНСКАЯ, МАНДРУКЕВІЧ, ШЧУРОК, ВАЛОДЗЬКІНА.

УСЮ ЎВАГУ—ТОРФУ

Старшыня калгаса «Шлях сацыялізма» Сенненскага раёна Грынявецкі Баліслаў узяў на далонь буйнае, нібы гарох, зярно жыта і растлумачыў:

— Угноілі мы ўчастак у 6 гектараў тарфяным гноем і вось буйнае, без адной пялушынкі, зярно. Касцяру няма і ў паміне. А такога зярна мы ўзялі з кожнага гектара па 16 цэнтнераў.

Шаснаццаць цэнтнераў з гектара, безумоўна, мала. Калі-б жыта было пасеяна радковай сеялкай ды ў тэрмін, — гаворыць Грынявецкі, — то гектар даўбы не менш 20, а мо і 25 цэнтнераў.

Гэту памылку калгаснікі выправілі ўвосень. Зялёная рунь жыта паказала, што будзе багаты ўраджай.

Зараз калгаснікі поўны клопатаў аб высокім ураджаі збожжа. Зараз у калгасе ідзе загатоўка і вывазка торфу на ўгнаенне.

Калгаснікі Любачка Іван, Кузьміч Фёдар, Шубка Мікіта ўключыліся ва ўсесаюзнае спаборніцтва за высокі ўраджай і абавязаліся на ўчастку ў 4 гектары зняць па 30 цэнтнераў ячменю з кожнага гектара. Звеннявыя Гарбачова Матруна і Лазарэвіч Адэля абавязаліся зняць з кожнага гектара ў сваіх звеннях па 12 цэнтнераў ільновалакна.

Торф быў загатоўлен летам. Ён падсох, выветрыўся. Зараз яго возяць для подсцілу жывёле. Разам з гэтым закладаюцца тарфяныя кампосныя кучы.

Усе калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Шлях сацыялізма» ўключыліся ва ўсесаюзнае спаборніцтва за высокі ўраджай і змагаюцца ў гэтым годзе за атрыманне ў сярэднім з кожнага гектара: 20 цэнтнераў зернавых, 7 цэнтнераў ільновалакна і 250 цэнтнераў бульбы.

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі ўзяліся за збор торфафекалія.

Калгас імя Энгельса, Нямойцянскага сельсавета, у якасці падсцілкі для жывёлы і для закладкі кампосных куч загатовіў і вывез торфу 480 тон. Калгас «Хамінічы» загатовіў больш 300 тон торфу.

А. МАХНАЧ.

ЗА 1000 ГЕКТАРАЎ НА ТРАКТАР

ЧАШНІКІ. Калгасы раёна ўключаюцца ва ўсесаюзнае спаборніцтва за высокі ўраджай. У калгасе «Паліталдзелец», Іванскага сельсавета, зварот удзельнікаў пленума зернавой секцыі Усесаюзнай Акадэміі сельскагаспадарчых навук імя В. І. Леніна прапрацаваны на нарадзе ільноводчага звяна Ляўшовай. Звяно атрымала ў 1936 годзе па 8 цэнтнераў ільновалакна з гектара.

— У 1937 годзе, — гаворыць звеннявая Ляўшова Ксеня, — мы даб'емся не менш 10 цэнтнераў. Маё звяно ўжо сабрала каля 4 тон попелу. Ільносемя ачышчана і засышана.

47 трактарыстаў чашніцкай МТС ўключыліся ў спаборніцтва. Яны абавязаліся даць на кожны трактар не менш як па 1.000 гектараў і эканоміць па 2 тоны гаручага, добраякасна апрацоўваць глебу. Паміж трактарыстамі разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва за выкананне ўзятых абавязацельстваў.

П. ЯЦКЕВІЧ.

МАЙСТРЫ ВЫСОКІХ УРАДЖАЯЎ

1936 сельскагаспадарчы год цікавы быў тым, што шырока было разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва ва ўсіх галінах, што толькі ўпартай і часнай працай, не гледзячы на неспрыяючае лета, стахановцы і ордэнаносцы даказалі, што ўраджай у нашых руках і ўсё залежыць ад нас саміх.

Тварэц новай Канстытуцыі таварыш Сталін у сваім дакладзе на Надзвычайным VIII З'ездзе Советаў сказаў, што **«совецкае сялянства — гэта зусім новае сялянства, падобнага якому яшчэ не ведала гісторыя чалавецтва».**

З кожным годам з недраў калгаснага сялянства вырастаюць усё новыя і новыя кадры, якія апракідваюць старыя аграправілы.

Як па зернавых, так і па тэхнічных культурах калгаснікі-стахановцы БССР дабіліся ў 1936 годзе рэкорднага ўраджаю. Калгас «Новае жыццё», Барысаўскага раёна, з 5 гектараў атрымаў па 400—500 цэнтнераў бульбы з кожнага гектара. Калгас «Большэвік», Барысаўскага раёна, з плошчы ў 4 гектары атрымаў па 500—558 цэнтнераў бульбы з гектара. Калгас «1 Мая», Слуцкага раёна, мае сярэдні ўраджай зернавых па калгасу 100 пудоў з кожнага гектара.

Высокіх ураджаяў дабіліся калгасы ордэнаноснай БССР па ільну. Звяно Мінінай Капярыны з калгаса «Май», Чачэрскага раёна, на плошчы 1,32 гектара атрымала па 13,13 цэнтнера ільновалакна з гектара і па 7,5 цэнтнера ільносемя. Звяно ордэнаноскі Гаварковай Анастасіі з калгаса «Перамога», Шклоўскага раёна, атрымала з гектара 11,2 цэнтнера ільновалакна. Звяно Сніжэля Владзіміра з калгаса «Комунар», Дрысенскага раёна, атрымала з гектара 11,13 цэнтнера ільновалакна з гектара.

Стахановцы ў барацьбе за высокі ўраджай прымянялі новыя агратэхнічныя правілы, як мульчыраванне, паліўка, падкормка, чаго раней наша сельская гаспадарка не ведала.

Задача зараз заключаецца ў тым, каб хутчэй прымяніць увесь вопыт лепшых людзей нашай краіны ў шырокай практыцы калгаснага будаўніцтва.

Нельга не захапляцца такімі ўраджаямі, якіх дабіліся стахановцы ў мінулым годзе. Таварыш Тапыгараў з калгаса імя Сталіна, Велойскага раёна (Якутыя) атрымаў на сваім вопытным участку 117 цэнтнераў ячменю з гектара, загадчык хаты-лабараторыі калгаса «1 Мая», Міньковецкага раёна, Вінніцкай вобласці, т. Яворскі атрымаў 80 цэнтнераў азімай пшаніцы з гектара.

На працягу 4 дзён ва Ўсесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя **В. І. Леніна** адбываўся пашыраны пленум зернавой секцыі. Лепшыя стахановцы калгаснай вытворчасці разам з акадэмікамі падводзілі вынікі першага года барацьбы за лозунг таварыша Сталіна аб вытворчасці ў нашай краіне 7—8 мільярдаў пудоў зярна кожны год.

З вялікай цікавасцю ўдзельнікі пленума зернавой секцыі заслухалі загадчыка хаты-лабараторыі калгаса «Маладая гвардыя», Белаглазеўскага раёна, Заходне-Сібірскага края тав. Чуманова. Ён на сваім участку ў 6 гектараў сабраў у мінулым годзе па 50 цэнтнераў яравой пшаніцы з гектара. Каб даць зямлі больш вільгаці, Чуманоў арганізаваў на сваім участку затрымку снегу. Больш двух метраў вышынёй на кожным гектары быў штучна затрыман снег.

Тав. Чуманоў абавязаўся ў гэтым годзе на плошчы ў 200 гектараў зняць ураджай па 50—80 цэнтнераў з гектара. Каб забяспечыць выкананне гэтага абавязацельства, ён на кожны гектар вопытнага ўчастка ўносіць 40 тон гною, 15 цэнтнераў попелу, 8 цэнтнераў курынага памёту, 5 цэнтнераў суперфасфату, 30 цэнтнераў фекалія.

Адзін за адным выступалі на пленуме стахановцы. Брыгадзір-ордэнаносец зернавога саўгаса «Большэвік» (Крым) тав. Левен на ўчастку у 7 гектараў атрымаў па 80 цэнтнераў азімай пшаніцы з гектара, а сярэдні ўраджай з 400 гектараў атрыман па 25 цэнтнераў з гектара.

З вялікай увагай і цікавасцю пленум заслухаў выступленне стахановца-агранома Д. Е. Камышчэнка. Ён расказаў аб новых метадах сяўбы.

— Будучы кожны дзень звязан з калгаснай вытворчасцю, я заўсёды задумваўся, — гаворыць Камышчэнка,—чаму мы да гэтага часу сеем старым радковым спосабам і старымі сеялкамі, прычым абавязкова міжраддзямі ў 13—15 сантыметраў. Гэта дае гаспадарцы вялікія страты. Плошча, якая рыхтавалася па сяўбы, гуляе. У ёй разводзіцца пустазелле. Ад сонца глеба, непакрытая пасевамі, трэскаецца і праз шчыліны выпарваецца вільгаць.

— Старыя сеялкі, — гаворыць тав. Камышчэнка, — можна перарабіць з міжраддзямі ў 6,5 сантыметраў. У новай сеялцы Камышчэнка змяніў скрынкі, па іншаму паставіў высяўныя катушкі, пераставіў сашнікі ў тры рады, і там дзе іх было 13, стала 27.

— Прымяняючы новыя метады сяўбы, — гаворыць тав. Камышчэнка, — 1937 год дасць нашай краіне новае павышэнне ўраджаю і гэта будзе практычным ажыццяўленнем указанняў таварыша Сталіна аб 7—8 мільярдах пудоў хлеба.

Велізарнейшае поле дзейнасці адкрываюць работы селекцыянераў тт. Мейстэра, Ціціна, Дзержавіна, якія пасягнулі на прыроду і фармаставанне раслін. Іх работы па вывядзенню жытнепшанічных і пшанічна-пырэйных гібрыдаў робяць сапраўдную рэволюцыю ў сельскай гаспадарцы. Новыя культуры маладога селекцыянера Дзержавіна, які пекалькі год займаецца скрэшчваннем пшаніцы з многагадовым жытам, даюць магчымасць пашыраць гэтую культуру ў кожным раёне нашай краіны.

З вялікай цікавасцю было заслухана выступленне ордэнаносца акадэміка І. Г. Эйхфельда. Скрэшчваючы яравыя гатункі з азімымі, Эйхфельд выявіў скаспелыя гатункі ячменю, якія даюць добры ўраджай у самых суровых умовах поўначы. Ім выведзены гатункі бульбы і іншых культур, якія растуць за палярным кругам.

Удзельнікі пленума зернавой секцыі Ўсесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя В. І. Леніна звярнуліся з адозвай да ўсіх калгаснікаў, агранамаў арганізаваць усесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай.

Гэты зварот калгаснікі нашай рэспублікі сустрэлі з велізарнейшым уздымам. Калгас за калгасам, брыгада за брыгадай, асобныя звенні ўключаюцца ў сацыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай.

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны партызан», Менскага раёна, дзе старшынёй працуе ордэнаносец Сяргей Бейне, першымі ў Беларусі адгукнуліся на зварот удзельнікаў пленума зернавой секцыі Акадэміі і ў сваю чаргу звярнуліся з пісьмом да ўсіх калгаснікаў БССР разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва за сталінскі ўраджай 1937 года.

Гэты калгас намеціў канкрэтныя мерапрыемствы ў барацьбе за высокі ўраджай, абавязаўшыся атрымаць сярэдні ўраджай зернавых па калгасу не менш 150 пудоў з гектара, бульбы не менш 1.250 пудоў; па брыгадзе № 2 атрымаць сярэдні ўраджай аўса не менш 255 пудоў з гектара; па першай і трэцяй брыгадах атрымаць ўраджай ячменю не менш 245 пудоў з гектара; на ўчастку з 5 гектараў атрымаць ўраджай яравой пшаніцы не менш 240 пудоў і бульбы з паасобных участкаў—3.600—4.000 пудоў з гектара.

Канкрэтныя абавязацельствы па ўзняццю ўраджайнасці ўзяў на сябе і калгас «Чырвоны берег», Аршанскага раёна, і рад калгасаў нашых раёнаў Совецкай Беларусі.

Але аднымі толькі абавязацельствамі і рэзалюцыямі ўраджайнасць не ўзнімеш. За добрымі абавязацельствамі, пастановамі і рэзалюцыямі павінна паследаваць практычная работа ў барацьбе за высокі ўраджай. Кожны калгас, кожная калгасная брыгада павінны зараз па-баявому разгарнуць падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Кожны калгаснік павінен памятаць, што толькі добраякаснай падрыхтоўкай і правядзеннем веснавой пасеўнай кампаніі можна з поспехам выканаць узятыя на сябе сацыялістычныя абавязацельствы ў барацьбе за сталінскі ўраджай.

Д. МАЛЕВІЧ.

СУД НАД ЗАБОЙЦАМІ М. В. ПРОНІНАЙ

МЕЛЕКЕС, 18 студзеня. (БЕЛТА). Учора выязная сесія Вярхоўнага суда РСФСР пачала слуханнем справу аб зверскім забойстве дэлегаткі Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Советаў М. В. Пронінай.

К пачатку працэса вуліца каля кінотэатра, дзе засядае суд, была запружана працоўнымі. Глядзельная зала не магла ўмясціць усіх жадаючых прысутнічаць на працэсе.

Пасля папярэдняга допыту абвінавачваемых дзяржаўны абвінаваўца тав. Нюрына выступіла з хадайніцтвам пачаць судовае следства разглядам асобных эпізодаў, якія мелі месца перад забойствам Пронінай. Суд задаволіў хадайніцтва.

Першым дапытваўся сведка Новічкаў.

З яго допыту і допыту абвінавачваемых Розава і Федотава высветлілася, што забойства Малава было загадзя абдумана і зроблена падсудныімі Розавым і Федотавым.

Пры допыце суд устанавіў, што бацька Розава — былы ўласнік бакалейнай лаўкі, спекулянт — гандляваў мукой і самагонам.

Затым суд перайшоў да разгляду пытання аб бандыцкім нападзе абвінавачваемага Розава на гр. Салазкіна.

Сведка настаўніца-комсамолка тав. Субоціна расказала аб аграбленні яе Розавым 20 снежня 1936 года.

Суд поўнасцю ўстанавіў, што Розаў, Федотаў і Ешчэркін склалі банду, якая займалася ўзброенымі грабяжамі і забойствамі.

Сёння выязная сесія Вярхоўнага суда РСФСР перайшла да разгляду акалічнасцей забойства М. В. Пронінай. Судовае следства пачалося з допыту сведкі Оўчынікавай.

Карціну забойства Пронінай дапоўніў допыт аднаго з непасрэдных удзельнікаў злачынскага забойства — Ешчэркіна. Як ні імкнуўся Ешчэркін утоіць свой удзел у забойстве Пронінай, з яго-ж паказанняў высветлілася, што ў гэтай жудаснай справе яму належыць актыўная роля.

Далейшы ход судовага следства высветліў новыя падрабязнасці, якія сведчаць, што подлая банда зусім свядома ішла на забойства дэлегата Надзвычайнага З'езда Советаў Пронінай.

Суд перайшоў да допыту Канстанціна — зяця Ешчэркіна. Бацька Ешчэркіна быў кулаком, яго раскулачылі. Канстанцінаў паказаў, што Дзмітрый Ешчэркін, як і яго бацька, ненавідеў совецкую ўладу. Ешчэркіны спадзяваліся на яе звяржэнне і зварот кулацкага добрабыту.

На вячэрнім пасяджэнні суд шмат увагі ўдзяліў выяўленню асобы Александра Розава — галоўнага арганізатара забойства Пронінай, а таксама той ролі, якую адыгрывалі ў злачынстве яго сястра Гуляева, яе муж Гуляеў і маці Розава.

Пачуцці глыбокай гідлівасці і агіды выклікалі прачытаныя дзяржаўным абвінаваўцай пахабныя антысовецкія вершы, напісаныя Розавым, а таксама паказанні бандыта пра сваю татуіроўку, якой Розаў знарок прыдаў контрэволюцыйны, цынічны характар.

Допытам Розавых і Гуляевых скончылася судовае следства.

Пасля перапынку з вялікай прамовай выступіла дзяржаўны абвінаваўца тав. **Нюрына.** Яна прызнала Александра Розава асноўным арганізатарам забойства Пронінай, а Федотава і Ешчэркіна — актыўнымі суўдзельнікамі гэтага жудаснага злачынства і патрэбавала для гэтых трох бандытаў расстрэлу.

Патрабаванне дзяржаўнага абвінаваўцы было сустрэта громам апладысментаў.

У Вышэйшым педінстытуце (Менск) ёсць польская секцыя. НА ЗДЫМКУ: студэнты польскай секцыі IV курса пітфака на занятках. Сядзяць справа налева: выдатніца тав. Батвілоўская Н. В. — дачка калгасніка калгаса імя 8-га студзеня, Дзяржынскага раёна; сын калгасніка Вайткевіч Ф. І. з калгаса «Чырвоная завіпаўка», Уваравіцкага раёна, Лапіцкага сельсовета; Нядавецкая Е. С.—дачка рабочага; Альшаноўская Е. І. — дачка рабочага. Фото Лупейка. (БСФ)

ВЫДАННЕ ТВОРАЎ КЛАСІКАЎ ПОЛЬСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Дзяржаўнае выдавецтва БССР выдае ў бягучым годзе на польскай мове творы раду класікаў польскай літаратуры. У выдавецкі план уключан выпуск кніг—«Пан Тадэўш»—Міцкевіча, выбраных твораў Жэромскага, «Хам»—Оржэшко, «У пустыні»—Сенкевіча і інш.

Агульны тыраж мастацкай літаратуры, які будзе выдан у бягучым годзе на польскай мове, дасягне 58 тысяч экземпляраў. У мінулым годзе было выпушчана мастацкай літаратуры ў колькасці 40 тысяч эка.

АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ВАРАШЫЛАЎСКАГА РАЁНА

Вечарам 18 студзеня ў клубе імя Сталіна адкрылася першая алімпіяда мастацкай самадзейнасці Варашылаўскага раёна г. Менска. Глядзельная зала была запоўнена рабочымі, служачымі, інжынерна-тэхнічнымі работнікамі і студэнтамі. У першы вечар з вялікім поспехам выступілі: аб'яднаны хор у колькасці 150 чалавек, які выканаў спевы «Франца», «Забалела, ты мая галаванька» і «Ну, як не запець»; драмгурток завода імя Молатава паказаў два ўрыўкі з «Бориса Годунова», Пушкіна; хор белпедтэхнікума выканаў беларускія і рускія народныя песні; танцавальны гурток клуба будаўнікоў — танцы «Юрачка» і «Лявоніха».

Глядачы вельмі цёпла сустрэлі выступленні з танцамі, спевамі і мастацкім чытаннем вучняў 28 і 45 школ.

У алімпіядзе прымала ўдзел каля 300 чалавек з прадпрыемстваў: фабрыкі імя 8-га сакавіка, друкарні імя Сталіна, трамвайнага парка, студэнтаў політэхнічнага інстытута і т. д.

Сёння алімпіяда закрываецца.

СЕСІЯ СОВЕТА ПА ВЫВУЧЭННЮ ПРАДУКЦЫЙНЫХ СІЛ БССР

18 студзеня ў Менску закончылася сесія совета па вывучэнню прадукцыйных сіл пры Акадэміі навук БССР. Сесія была прысвечана аднаму пытанню — газіфікацыі (пераапрацоўка цвёрдага паліва ў газ) прамысловых цэнтраў БССР на базе торфу.

У яе рабоце прымалі ўдзел відныя вучоныя і спецыялісты Масквы, Ленінграда, прадстаўнікі Дзяржплана БССР, гаспадарчых наркаматаў, навукова-даследчых інстытутаў, работнікі Акадэміі навук і інш.

Сесію адкрыў старшыня совета па вывучэнню прадукцыйных сіл, член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР т. Шпенцэр.

Усяго было заслухана 11 даклада — тэхнічнага кіраўніка камісіі па газіфікацыі Масквы інж. Майзельса, інж. Дэмбо, Розенкранца, Багданава (Масква), Ерохіна і Ільяшэвіча (Ленінград), інж. Кірпічнікава, Адэльскага (Менск) і інш.

Дакладчыкі азнаёмілі прысутных з вопытам работы па газіфікацыі ў розных абласцях Саюза.

На вячэрнім пасяджэнні 18 студзеня ў спрэчках выступіў намеснік старшыні СНК і старшыня Дзяржплана БССР тав. Любовіч, сустрэты апладысментамі.

Тав. Любовіч указаў, што наглядаецца недаапэнка газіфікацыі з боку некаторых устаноў і работнікаў. Між тым, пытанне аб пашырэнні нашых энергарэсурсаў стаіць з усёй вастрынёй. Гэта пытанне ўпіраецца ў аддаленасць тарфяных масіваў ад электрастанцый. Найбольш рэльефна гэта наглядаецца ў Менску, дзе для забеспячэння электрастанцыі палівам прыходзіцца дастаўляць яго за дзесяткі кілометраў. Прычым адначасова з торфам перавозіцца да 60 проц. вады і попелу, які ёсць у торфе. Таму пытанне аб газіфікацыі вельмі актуальнае. Неабходна пакончыць з больш чым саматужніцкім забеспячэннем палівам нашых энергабаз.

Тав. Любовіч высунуў перад удзельнікамі сесіі рад канкрэтных задач у галіне работы па газіфікацыі.

Сесія даручыла совету па вывучэнню прадукцыйных сіл пры Акадэміі навук БССР распрацаваць план канкрэтных мерапрыемстваў па газіфікацыі нашай рэспублікі.

Сесія паслала прывітальныя тэлеграмы тт. П. Ф. Гікало і М. М. Галадзеду.

М. КІН.

Герой Совецкага Саюза тав. Слепнёў у Бабруйску

Цёпла сустрэлі працоўныя Бабруйска прыбыўшага 18 студзеня з Масквы героя Совецкага Саюза тав. Слепнёва, імя якога носіць бабруйскі аэраклуб.

Увечары тав. Слепнёў выступіў на сходзе стаханаўцаў прадпрыемстваў. У выключна цікавым дакладзе герой Совецкага Саюза расказаў аб гісторыі совецкай авіяцыі і задачах, якія перад ёй стаяць зараз.

Начальнік аэраклуба тав. Ефрэмічаў зрабіў даклад аб дзейнасці аэраклуба.

Выступаўшыя стаханаўцы дзякавалі тав. Слепнёва за прыезд у Бабруйск. Яны абавязваліся змагацца за пярэшнства Бабруйска ў вытворчай і абаронай рабоце. Дырэктары дрэваапрацоўчага камбіната і фанернага завода імя Кірава тт. Зубрыцкі і Мальчык абавязаліся пабудаваць сёлета парашутную вышку для рабочых сваіх прадпрыемстваў. (БЕЛТА).

ПІЛЬНАСЦЬ СТРЭЛАЧНІКА

Газета «Большевистский сигнал» (орган палітаддзела Аршанскага аддзялення Заходняй чыгункі) паведамляе аб праяўленай пільнасці стрэлачніка-стаханаўца станцыі Красное тав. Краўцова. Гэтымі днямі праз гэту станцыю следаваў поезд № 1060. Стрэлачнік Краўцоў, стоячы на пасту, прыкмеціў у адным з вагонаў лопнуўшую рэсору, якая пагражала крушэнню поезда. Неадкладна ён астанавіў поезд. Вагон з лопнуўшай рэсорай быў адцэплен, і крушэнне папярэджана.

АД ПАРТКАЛЕГІІ

Парткалегія пры ўпаўнаважаным КПК па БССР просіць т. Казлова Аляксея Харытонавіча (раней знаходзіўшагася ў Ленінградзе) з'явіцца ў ПК (Менск, Чырвонаармейская, 16, трэці паверх, пак. № 27).

Просьба да ўсіх устаноў і арганізацый, ведаючых месцазнаходжанне паказанага таварыша, паведаміць у ПК.

ПАРТКАЛЕГІЯ.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БДТ-1 — «Як не завуць», Дзярж. Яўр. тэатр БССР — «Людзі ў белых халатах», «Чырвоная зорка»—«Канцэрт Бетховена». Дзіцячы гукавы кінотэатр — «Канцэрт Бетховена», «Пролетарый» — «Бесприданница», «Інтэрнацыянал»— «Кандыд», «Спартак»—«Лётчыкі».

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

16 рэкордаў БВА па штанзе

У менскім Доме Чырвонай Арміі скончыліся спаборніцтвы цяжкаатлетаў Беларускай ваеннай акругі. Штангісты ўстанавілі 16 новых акруговых рэкордаў. Чэмпіён РСЧА ў лёгкай вазе, малодшы камандзір Анатолій Самковіч паставіў тры новых усеармейскіх рэкорды: у штуршку правай рукой — 83,5 кілограма, у штуршку двума рукамі—120 кілограмаў і ў рыўку левай — 73.5 кілограма. Разультат апошняга руху перавышае належачы яму-ж усебеларускі рэкорд. Самковіч набраў абсалютную суму ў траеборыі — 300 кілограмаў.

Па боксу быў цікавы матч на званне абсалютнага чэмпіёна БВА паміж тт. Гайдуком (сярэдняя вага) і Івановым (поўнапяжкая вага). Гайдук выдатным ударам у чэлюсць накаўтаваў Іванова ў першым-жа раундзе.

Па французскай барацьбе пераможцамі выйшлі матарыст Школьнікаў, курсант Прохараў, чырвонаармейцы Ахматаў і Рабінін, малодшыя камандзіры Румянцаў і Нікішкін і лейтэнант Кічылаў.

ЗАГАД № 8

ПА НАРОДНАМУ КАМІСАРЫЯТУ ФІНАНСАЎ БССР

гор. МЕНСК. 5 студзеня 1937 года

АБ УСТАНАЎЛЕННІ ЦВЁРДЫХ НОРМ ДАХОДНАСЦІ НЕКААПЕРАВАНЫХ САМАТУЖНІКАЎ І РАМЕСНІКАЎ НА 1937 ГОД

На падставе арт. 24 «Палажэння аб падаходным падатку з прыватных асоб», зацверджанага пастановай ЦВК і СНК Саюза ССР ад 17 мая 1934 г. (З. З. СССР. 1934 г., № 27) загадваю:

I

1. Усе асобы, якія займаюцца без прымянення наймовай працы саматужнымі і рамеснікамі промыслам, ізвозам і абслугоўваннем асабістых і гаспадарча-бытавых патрэб насельніцтва (плотнікі, маляры, сталяры, печнікі, кровельшчыкі, надправодчыкі, слесары, электрамантёры, шкляры, трубачысты, палацёры абойшчыкі, надавозы, пральні, насільшчыкі, пераплётчыкі, цырульнікі, фатографы, оптыкі) абвешчаны за ўстаноўлены тэрмін (або да пачатку промысла, калі ён пачынаецца ў сярэдзіне года) выбраць на свае промыслы рэгістрацыйныя пасведчанні ў горсавета па месцу вытворчасці промысла.

Саматужнікі і рамеснікі, якія займаюцца перасовачнымі промысламі, павінны выбіраць рэгістрацыйныя пасведчанні ў горсавета па месцу пастаяннага жыхарства.

2. Рэгістрацыйныя пасведчанні на свае промыслы павінны таксама выбіраць члены прамысловых каапераціўных арцелей і арцелей інвалідаў каапераціўных, працуючых апрача арцелей на старану, рабочыя і служачыя, якія сістэматычна займаюцца звышчасова саматужнымі і рамеснікамі промысламі па рабоце на заказчыка.

Вытворчасць вырабаў не на заказ, а для продажу на рынку членам прамысловых каапераціўных арцелей і арцелей каапераціўных інвалідаў, працуючым на старану, а таксама рабочым і служачым, якія займаюцца промысламі звышчасова, забараняецца і рэгістрацыйныя пасведчанні на гэтакія промыслы не выдаюцца.

3. Для атрымання рэгістрацыйнага пасведчання саматужнікі і рамеснікі абавязаны прадставіць падатковаму інспектару горсавета пасведчанне аб кваліфікацыі ад арганізацыі рамысловай каапераціўнай і сваю фотакартку, а таксама прад'явіць пашпарт (а ў тых месцах, дзе пашпартызацыя не праведзена, дакумент, што замяняе пашпарт).

Не патрабуецца прадстаўлення пасведчання аб кваліфікацыі для атрымання рэгістрацыйных пасведчанняў для фурманоў, надавозаў, палацёраў, плотнікаў, трубачыстаў, прачак, насільшчыкаў, чысцільшчыкаў абутку, а таксама для тых саматужнікаў і рамеснікаў, якія прадстаўлялі пасведчанні аб кваліфікацыі ў 1936 годзе і прадаўжаюць у 1937 г. займацца тым-жа промыслам.

4. У выпадку выяўлення асоб, якія займаюцца забароненымі промысламі, пералічанымі ў параграфе 3 правіл рэгістрацыі саматужных і рамесніцкіх промыслаў, зацверджаных пастановай СНК Саюза ССР 26-III 1936 г. № 562, у тым ліку промыслам з прымяненнем працы наймовых рабочых, матарыялы аб гэтакіх асобах перадаюцца органам пракуратуры для прыцягнення вінаватых у гэтым асоб да крымінальнай адказнасці.

Штрафы на такіх асоб не накладаюцца і да абкладання падаткамі не прыцягваюцца.

II

1. Для саматужнікаў і рамеснікаў, якія працуюць без ужывання наймовай працы ў пералічаных ніжэй промыслах, устанавіць наступныя цвёрдыя (гранічныя) нормы даходнасці для абкладання падаходным падаткам у 1937 годзе:

А. Для саматужнікаў і рамеснікаў, якія займаюцца пашыўкай плашчэй, бялізны, абутку, галаўных убораў і т. д. на заказ з матэрыялаў заказчыка:

Цвёрдыя (гранічныя) нормы чыстага даходу ў рублях

НАЗВА ПРОМЫСЛАЎ	У гг. Віцебску, Гомелі і Менску	У гг. Бабруйску, Оршы, Барысаве, Полацку, Магілеве	У г.г. Жлобіне, Рагачове, Мазыры, Слуцку і Рэчыцы	У Асіпавічах, Добрушы, Быхаве, Клімавічах, Ветцы, Калінкавічах, Лепелі, Гарадку, Мсціслаўлі, Горках, Петрыкаве, Дубровне, Чэрвені, Чаўусах, Шклове.	У Бешанковічах, Нароўлі, Брагіне, Прапойску, Бялынічах, Пухавічах, Бярэзіне, Парычах, Глушку, Сянно, Дзяржынску, Суражы, Дрыве, Смаляевічах, Каспяровічах, Талачыне, Капылі, Тураве, Крупках, Уздзе, Крычаве, Хойніках, Лёзне, Чачэрску, Лоеве, Чашніках, Чэрыкаве	Усе астатнія мясцовасці БССР
1	2	3	4	5	6	7
1. Краўцы мужчынскія на заказ з матэрыялу заказчыка:						
а) вышэйш. кваліф.	13000	12000	8500	8000	8000	7000
б) сярэдняй кваліфік.	9500	8500	7000	6500	6000	5500
в) ніжэйш. кваліфік.	7000	6000	5000	4500	4000	3500
2. Краўцы жаночыя на заказ з матэрыялу заказчыка:						
а) вышэйш. кваліфікацыі	16000	14000	9500	9000	8000	
б) сярэдняй кваліфікацыі	11000	9500	8000	7000	6500	
в) ніжэйшай кваліфікацыі	8000	7000	6500	6000	5000	
3. Белашвейкі на заказ з матэрыялу заказчыка:						
а) вышэйшай кваліфікацыі	9000	7500	6000	4500	4000	4000
б) сярэдняй кваліфікацыі	6500	5000	4500	4000	3500	3500
в) ніжэйшай кваліфікацыі	4500	4000	3000	2800	2500	2500
4. Краўчыхі па пашыўцы лёгкага жаночага адзення на заказ з матэрыялу заказчыка:						
а) вышэйшай кваліфікацыі	11000	9500	8000	7000	6000	5500
б) сярэдняй кваліфікацыі	8500	7000	6000	5500	5000	4500
в) ніжэйшай кваліфікацыі	5500	5500	5000	4000	3500	3000
5. Краўцы і краўчыхі—падзяшчыкі на даму ў заказчыка	4000	3000	2500	2000	1800	—
6. Трыкатажніцы на заказ з матэрыялу заказчыка:						
а) пры рабоце ручным метадам	3000	—	—	—	—	—
б) пры рабоце машынным метадам	9000	—	—	—	—	—
7. Мярэжачніцы на заказ з матэрыялу заказчыка:						
а) пры ручной рабоце	7000	4000	3500	—	—	—
б) пры машыннай рабоце	12000	8000	7000	—	—	—
8. Шапачнікі на заказ з матэрыялу заказчыка	12000	8500	6500	6500	6500	5500
9. Шляпачніцы на заказ з матэрыялу заказчыка:						
а) перадзелка фетравых і саломеных шляп	13000	10000	8000	7000	—	—
б) выраб вязаных шапачак-берэтаў:						
ручным метадам	3000	2500	2000	2000	—	—
машынным метадам	9000	8000	7000	—	—	—
10. Скарняжнікі на заказ з матэрыялу заказчыка	16000	—	—	—	—	—
11. Карсетніцы на заказ з матэрыялу заказчыка	10000	—	—	—	—	—
12. Шаўцы на заказ з матэрыялу заказчыка:						
а) вышэйшай кваліфікацыі	14000	11000	10000	9000	8500	8000
б) сярэдняй кваліфікацыі	12000	10000	9000	8000	7000	7000
в) ніжэйшай кваліфікацыі	7500	6000	6000	5000	5000	4000

Цвёрдыя (гранічныя) нормы чыстага даходу ў рублях

НАЗВА ПРОМЫСЛАЎ	У гг. Віцебску, Гомелі і Менску	У гг. Бабруйску, Оршы, Барысаве, Полацку, Магілеве	У гг. Жлобіне, Рагачове, Мозыры, Слуцку і Рэчыцы	У Асіпавічах, Добрушы, Быхаве, Клімавічах, Ветцы, Калінкавічах, Лепелі, Гарадку, Мсціслаўлі, Горках, Петрыкаве, Дубровне, Чэрвені, Чаўусах, Шклове.	У Бешанковічах, Нароўлі, Брагіне, Прапойску, Бялынічах, Пухавічах, Бярэзіне, Глушку, Сянно, Дзяржынску, Суражы, Дрыве, Смаляевічах, Каспяровічах, Талачыне, Капылі, Тураве, Крупках, Уздзе, Крычаве, Хойніках, Лёзне, Чачэрску, Лоеве, Чашніках, Чэрыкаве	Усе астатнія мясцовасці БССР
1	2	3	4	5	6	7
13. Загатоўшчыкі на заказ з матэрыялу заказчыка:						
а) вышэйшай кваліфікацыі	18000	15000	13500	12000	10000	7000
б) сярэдняй і ніжэйшай кваліфікацыі	13000	11000	10000	9000	7000	7000
14. Разрысоўка і вышыўка бялізны заказчыка:						
а) пры рабоце ручной	7000	—	—	—	—	—
б) пры рабоце машыннай	12000	—	—	—	—	—
15. Выраб матрацаў на заказ з матэрыялу заказчыка	12000	—	—	—	—	—
16. Пашыўка кажухоў на заказ з матэрыялу заказчыка	—	7000	—	—	—	—
17. Вяровачнікі на заказ з матэрыялу заказчыка	—	—	12000	—	—	—
18. Выраб валенага абутку на заказ з матэрыялу заказчыка	8000	—	—	—	4500	—
Б. Для саматужнікаў і рамеснікаў, якія займаюцца пачынкай і рамонтам рэчаў, належачых заказчыкам:						
19. Рамонт абутку заказчыка:						
а) у шестаянных памяшк.	11000	8500	7000	6000	5000	4000
б) вулічныя падбойшчыкі	5000	4500	4500	—	—	—
20. Заліўка галош заказчыка	6000	4000	4000	3000	2500	2000
21. Кавалі па рамонту рэчаў заказчыка:						
а) вышэйшай кваліфікацыі	17000	14000	14000	10000	10000	9500
б) сярэдняй і ніжэйшай кваліфікацыі	15000	10000	10000	9000	8000	7500
22. Слесары і механікі:						
а) па рамонту машын і веласіпедаў заказчыка	25000	20000	—	—	—	—
б) па рамонту іншых гаспадарчых рэчаў заказч.	12000	10500	10000	9000	—	6000
23. Абойшчыкі мёблі з матэрыялаў заказчыка	13000	10000	—	—	—	—
24. Гадзіншчыкі (па рамонту гадзіннікаў):						
а) вышэйшай кваліфікацыі	18000	13500	12000	10000	8500	8000
б) сярэдняй і ніжэйшай кваліфікацыі	10000	10000	9000	7500	6500	6000
25. Бляхеры па рамонту гаспадарчых рэчаў	12500	11000	11000	7000	7000	6000

Цвёрдыя (гранічныя) нормы чыстага даходу ў рублях

НАЗВА ПРОМЫСЛАЎ	У гг. Віцебску, Гомелі і Менску	У гг. Бабруйску, Оршы, Барысаве, Полацку, Магілеве	У гг. Жлобіне, Рагачове, Мозыры, Слуцку і Рэчыцы	У Асіпавічах, Добрушы, Быхаве, Клімавічах, Ветцы, Калінкавічах, Лепелі, Гарадку, Мсціслаўлі, Горках, Петрыкаве, Дубровне, Чэрвені, Чаўусах, Шклове.	У Бешанковічах, Нароўлі, Брагіне, Прапойску, Бялынічах, Пухавічах, Бярэзіне, Глушку, Сянно, Дзяржынску, Суражы, Дрыве, Смаляевічах, Каспяровічах, Талачыне, Капылі, Тураве, Крупках, Уздзе, Крычаве, Хойніках, Лёзне, Чачэрску, Лоеве, Чашніках, Чэрыкаве	Усе астатнія мясцовасці БССР
1	2	3	4	5	6	7
В. Для саматужнікаў і рамеснікаў, якія абслугоўваюць асабістыя і гаспадарча-бытавыя патрэбы грамадзян:						
26. Цырульнікі:						
а) з жаночай завіўкай	15000	13000	10000	9000	8000	7000
б) іншыя	13000	11000	9500	8500	—	—
27. Фатографы:						
а) у пастаян. памяшк.	18000	15000	12000	11000	10000	10000
б) вулічныя	15000	12000	12000	10000	10000	10000
28. Шкляры	10000	8000	6000	5000	5000	4000
29. Пераплётчыкі	8500	7000	6000	—	—	—
30. Тачыльшчыкі	5000	5000	5000	—	—	—
31. Чыстка абутку:						
а) з продажам шнуркоў, гуталіна ваксы, набоек з шурупамі, сцелек картонных, гузікаў для абутку	8000	7500	7000	—	—	—
б) толькі чыстка абутку	5000	4000	4000	—	—	—
32. Афарбоўка адзення:						
а) з хімічнай чысткай	12000	12000	—	—	—	—
б) без хімічнай чысткі	9000	8000	8000	7000	7000	5500
33. Надавозы	—	7000	—	—	—	—
34. Перавозка грузаў на цялежках	5000	3000	—	—	—	—
35. Жывапісцы	—	—	—	—	5000	—
36. Кровельшчыкі	—	—	—	—	4000	—
37. Печнікі	—	—	—	—	—	5000
Г. Для саматужнікаў і рамеснікаў па вырабу з уласнага матэрыялу на заказчыка і для продажу на рынку вырабаў з дрэва, саломеных вырабаў, ганчарных вырабаў, вырабаў з камня і цапак:						
38. Бондары	—	—	6000	6000	—	—
39. Калёсні	7000	7500	9000	8000	—	—
40. Такары па дрэву:						
а) пры механічным рухавіку	14000	—	—	—	—	—
41. Сталяры:						
а) па вырабу мёблі	12000	8500	6500	6000	6000	—
б) па іншых сталярных работах	8000	6500	5500	5000	5000	—
42. Выраб помнікаў	9000	6000	7500	—	—	—
43. Выраб дзіцячых цапак	6500	—	4000	—	—	—
44. Выраб кветак	3500	3500	3000	—	—	—
45. Выраб сіт і рашэт	—	—	8000	7000	6500	—
46. Выраб гліняных пасудаў:						
а) паліванай	13000	13000	—	—	—	—
б) іншай	9500	9000	—	—	9000	8000

2. Пры абкладанні саматужнікаў і рамеснікаў, працуючых у промыслах, для якіх устаноўлены цвёрдыя нормы даходнасці, у тых выпадках, калі в прычыны няпоўнай нагрузкі, прастояў у вытворчасці, хваробы і т. д. даход саматужнікаў ад промысла не дасягае нормы даходнасці, загадчыкі райгорфінаддзелаў могуць па хадайніцтвах асобных платнікаў, згодна арт. 27 Палажэння аб падаходным падатку з прыватных асоб і параграфа 71 інструкцыі НКФ Саюза ССР ад 10-III 1936 г. № 187, паніжаць гэтым саматужнікам плацяжы падатку.

Калі недавыпрацоўка, устаноўленая фінорганамі пры абследванні промысла, з'яўляецца вынікам заўсёды паніжанай працаздольнасці саматужніка (напрыклад, калі промыслам займаецца інвалід-старык, жанчына маючая дзяцей і занятая адначасова хатняй гаспадаркай), то ў кожным асобным выпадку з дазволу загадчыка горсавета вызначаецца сапраўдны даход такога саматужніка і з гэтага даходу вылічваецца падаходны падатак і культабор. Калі горсавета мае зусім праверэныя весткі аб заўсёды паніжанай працаздольнасці саматужніка, то абкладанне такога саматужніка па даходу ніжэй устаноўленай для яго промысла нормы даходнасці можа рабіцца ў асобных выпадках без заявы з боку платніка.

Пры ўсіх паказаных выпадках адхіленне ад норм даходнасці абкладанне павінна быць зацверджана загадчыкам горсавета.

3. Пры абкладанні саматужнікаў і рамеснікаў, у якіх дапаможныя работы выконваюцца членамі сям'і, даход іх павышаецца, але не больш чым на 50 процантаў устаноўленай цвёрдай нормы у залежнасці ад характару работы, выконваемай членамі сям'і, часу ўдзелу іх у промысле і выпрацоўцы.

Размер гэтага павышэння ўстанаўляецца на падставе абследвання кожнага абкладаемага саматужніка.

4. Члены сям'і, якія выконваюць у промыслах самастойную работу, павінны абкладацца асобна па адпаведнай норме даходнасці.

5. Пры абкладанні рабочых і служачых што сістэматычна займаюцца саматужнымі і рамеснікамі промысламі па працы на заказчыка звышчасова, а таксама каапераваных саматужнікаў — членаў вытворчых арцелей па даходах ад выканання заказаў, не на арцелі, а на старану прыстасоўваюцца нормы, устаноўленыя для адпаведных промыслаў з паніжэннем гэтых норм у залежнасці ад часу, затрачваемага саматужнікам на работу ў даным промысле і ад выпрацоўкі саматужніка.

Час працы на старану і размеры выпрацоўкі ўстанаўляюцца на падставе абследвання кожнага абкладаемага саматужніка. Паніжэнне норм для такіх саматужнікаў па якому-небудзь сярэдняму процанту катэгарычна забараняецца.

6. Тэрміны выплаты падаходнага падатку для саматужнікаў і рамеснікаў, працуючых у пералічаных промыслах, устанаўляюцца наступныя:

15 сакавіка 1937 г. — 25 проц. гадавога аклада.
15 мая 1937 г. — 25 проц. гадавога аклада.
15 жніўня 1937 г. — 25 проц. гадавога аклада.
15 кастрычніка 1937 г. — 25 проц. гадавога аклада.

7. У выпадку калі промысел узнікае ў сярэдзіне года, вылічаная па норме гадавая сума падатку памяншаецца ў адпаведнасці з часам існавання промысла ў гэтым годзе і павінна выплачвацца платнікам роўнымі часткамі ў агульнаўстаноўленыя тэрміны, якія застаюцца да канца года.

У такім-жа парадку пералічаецца падатак і ў выпадках ліквідацыі промысла на працягу года, пры гэтым лішнія заключаныя сумы аварачваюцца платніку або залічаюцца ў іншыя плацяжы, а недаплачаныя сумы дасягаюцца ў яшчэ-ж пяцідзённы тэрмін па ліквідацыі промысла.

8. Скідка з акладу падатку ў парадку п. «б» арт. 27 Палажэння аб падаходным падатку праводзіцца па хадайніцтву платніка ў кожным асобным выпадку пасля дасканальнай праверкі і з зацверджання загадчыка горсавета. Гэта скідка можа быць праведзена з аднаго або некалькі квартальных плацяжоў.

9. У выпадку няправільнага абкладання скаргі на абкладанне падаюцца ў раённую падатковую камісію па месцу абкладання і разглядаюцца ў 10-дзённы тэрмін. Пастановы раённых падатковых камісій могуць быць абскаржаны ў НКФ БССР, а пастановы НКФ БССР — у НКФ Саюза ССР.

Нам. народнага камісара фінансаў БССР М. МАТУСЕВІЧ.

Начальнік кіраўніцтва касавых плацяжоў НКФ БССР І. ЭЙДЛІН.

Уп. Галоўлітбела № К— 544. Друкарня газеты «Звязда» Менск Совецкая 63. К. Б. С.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2